ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

газета НАСТАЎНІЦКАЯ

№ 55(5237)
Субота,
19 мая
2001 года

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

Кошт у розніцу — 51 руб.

Пра што б хацелася сказаць на II з'ездзе настаўнікаў Рэспублікі Беларусь

"Штампуем дыпломы для беспрацоўных?"

Работа ў нас такая... Гэтыя словы з вядомай многім папулярнай, у свой час песні. Гэта добра і нават выдатна, калі ў чалавека ёсць праца, няхай нават і "такая".

А цяпер пагаворым пра лёс выпускнікоў сярэдніх школ і іншых навучальных устаноў. Як паведамляюць СМІ, толькі 30 працэнтаў выпускнікоў сярэдніх школ, якія не працягваюць вучобу далей, працаўладкаваны. Трывожная і нават сумная статыстыка: каля 70 працэнтаў выпускнікоў школ "павіслі" паміж небам і зямлёй, сноўдаюцца без справы. А ад гультайства да турэмных кратаў — адзін крок. Але ж 18-гадоваму хлопцу хочацца запрасіць знаёмую дзяўчыну калі не ў шыкоўны бар, дык хоць бы у недарагое кафэ ці кіно. А кішэнных грошай няма. Увесь час прасіць у бацькоў? Дык ці варта пасля гэтага здзіўляцца разгулу злачыннасці? Ды ў такой сітуацыі ніякая міліцыя і іншыя праваахоўныя органы не справяцца. Трэба ж змагацца не з наступствамі, а з прычынамі, якія іх параджаюць.

Праблему ж з лёсам выпускнікоў школ можна хоць бы часткова вырашыць на дзяржаўным узроўні. Прычым даволі проста, без дадатковых фінансавых затрат. Больш за тое — з эканамічнай выгадай для дзяржавы. Бо сёння ў тэхнікумы і прафесійна-тэхнічныя вучылішчы прымаюць не толькі выпускнікоў сярэдніх школ, але і выпускнікоў базавых школ. Але ж выпускнікі 9-х класаў маглі б быць і без гэтага пры справе — працягваць вучобу ў сярэдніх школах яшчэ цэлыя два гады. А на іх месца можна было б прыняць выпускнікоў 11 класаў, якія бадзяюцца без справы і папаўняюць рады вулічных хуліганаў.

Ёсць яшчэ адзін немалаважны аспект гэтай праблемы. Падрыхтоўка спецыяліста сярэдняга звяна ў тэхнікумах (каледжах) і прафтэхвучылішчах на базе сярэдняй школы абыходзіцца на 30—35 працэнтаў танней, паколькі тэрмін навучання мінімум на адзін год меншы.

Вось і ўзнікае заканамернае пытанне: няўжо ў нашай дзяржаве ёсць лішнія грошы? Падлеткаў прымаюць у тыя ж тэхнікумы, а дарослыя юнакі і дзяўчаты співаюцца, хуліганяць, становяцца нарканманамі, разносчыкамі венерычных захворванняў і СНІДу. Словам, пагаршаюць і без таго няпростую крымінагенную сітуацыю ў краіне.

Выходзячы з усяго вышэйсказанага прапаную лічыць мэтазгодным і эканамічна абгрунтаваным праводзіць у бліжэйшыя гады падрыхтоўку кадраў сярэдняга звяна ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах не на аснове базавай школы, а на аснове сярэдняй школы.

Прыемна казычуць нервы і цешаць душу паведамленні пра тое, што па колькасці студэнтаў на душу насельніцтва мы не ўступаем дзяржавам цывілізаванага свету, а часам і пераўзыходзім. Толькі прабачце, не трэба штампаваць дыпломы для беспрацоўных. А сёння ўжо абвастраецца праблема працаўладкавання па некаторых спецыяльнасцях выпускнікоў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Калі я сустракаю сваіх выпускнікоў Бабруйскага медвучылішча, якія працуюць пераважна або ў разнастайных магазінах, або гандлююць у "камках" на рынку, то становіцца сумна. Гэта ж дзяржаўныя грошы, выкінутыя на вецер. Ці вось такі прыклад. Дачка мінскага пляменніка скончыла летась з адзнакай (!) універсітэт на платнай аснове (!). Атрымала дыплом юрыста, а працу знайсці не можа. Паехаць на перыферыю? Дык муж працуе ў міліцыі і маладая сям'я мае ў Мінску кватэру. Заглядваюць работадаўцы ў пашпарт маладога спецыяліста і пачынаюць нос адварочваць: "Дык вы толькі што замуж выйшлі, а праз 2-3 месяцы пойдзеце ў дэкрэтны адпачынак..." І, як кажуць, ад варот паварот. Удумаемся толькі ў гэтую бязглуздзіцу: замуж і тым больш нараджэнне дзіцяці становяцца непераадольнай перашкодай для працаўладкавання. Атрымліваецца, што жанчыне трэба вельмі добра падумаць, а ўжо потым праявіць смеласць і нарадзіць дзіця. Нядзіўна, што Беларусь, як і многія іншыя краіны СНД, ператвараецца (ужо ператварылася!) у выміраючую краіну. Паводле апошніх звестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, за 2000 год насельніцтва Беларусі зменшылася на 29,3 тысячы чалавек. А за апошнія шэсць гадоў колькасць жыхароў скарацілася больш чым на 300 тысяч. Гэта першае вядомае за ўсю гісторыю Беларусі працяглае зніжэнне колькасці насельніцтва ў выніку натуральных страт. Асноўнымі яго прычынамі з'яўляюцца рост смяротнасці і спад нараджальнасці. Як бачым, статыстыка непрыемная і нават засмучальная.

Каб засцерагчы сябе ад непрыемнасцей у сувязі з працаўладкаваннем і з працай увогуле, многія маладыя людзі наогул не рэгіструюць свой шлюб. У гэтай сітуацыі рызыка можа аказацца не зусім высакароднай справай. Дапусцім, што сям'я ў гэты перыяд распадаецца, а маладая жанчына аказалася цяжарнай. Што рабіць? Зрабіць аборт? Але ён, на думку медыкаў, пры першай цяжарнасці небяспечны. Можна ўвогуле застацца без дзяцей. Нарадзіць дзіця? Тады яно будзе "бязбацькавічам", а маладая маці хутчэй за ўсё без аліментаў. Акрамя гэтага, рэзка змяншаюцца шанцы стварыць сям'ю паўторна.

Вось няхай і паспрабуюць дэлегаты з'езда адказаць на пытанне: а ці трэба рыхтаваць спецыялістаў з дыпломам у правай руцэ і "білетам" беспрацоўнага — у левай? Ёсць жа у нашай краіне ведамствы і людзі, якія павінны вывучаць попыт і даваць адпаведныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы спецыялістаў тых ці іншых прафесій. Мы ўступілі ўжо ў трэцяе тысячагоддзе... Нельга ж у рэшце рэшт жыццёва важныя для краіны пытанні вырашаць на вока — як-небудзь ды абыдзецца.

Яўген ШЫРОКІ,
ветэран педагагічнай працы.

Для Алены Аляксандраўны Лапушко пінскі дзіцячы сад № 2 стаў другім домам. Сярод цікаўнай дзятвы выпускніца Пінскага педвучылішча адчувае сябе надзвычай шчаслівай. І стараецца кожныя заняткі праводзіць творча, з выдумкай, каб хлопчыкі і дзяўчынкі маглі развіваць свае схільнасці, пашыраць кругагляд.

Энергічную, абаяльную выхавацельку любяць не толькі дзеці. Яе паважаюць і бацькі.

НА ЗДЫМКУ: Алена Лапушко.

Фота Уладзіміра СІВАЛАПА.

Даты

Дзень універсітэта

Трэці год у маі шматтысячны калектыў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта адзначае сваё галоўнае свята — Дзень універсітэта. 68 гадоў таму БДЭУ (тады — інстытут народнай гаспадаркі) шырока расчыніў свае дзверы для беларускай моладзі, якая імкнулася набыць прафесіі, такія неабходныя эканоміцы маладой рэспублікі. За гады існавання ВНУ традыцыі мацаваліся і развіваліся. Сёння БДЭУ — вядучая вышэйшая навучальная ўстанова ў сістэме нацыянальнай адукацыі па падрыхтоўцы эканамічных кадраў, якая цалкам адпавядае еўрапейскім і сусветным стандартам класічнага універсітэта. Больш як 70 тысяч спецыялістаў рознага эканамічнага профілю выйшлі з яго сцен за гэтыя гады і набылі патрэбныя прафесіі, значныя ў маштабах рэспублікі пасады.

Пра тое, якімі справамі жыве сёння вядучая эканамічная ВНУ рэспублікі, раскажа чытачам "Настаўніцкай газеты" рэктар БДЭУ Р.М.Карсека.

— Раман Міхайлавіч, вось ужо дзесяць гадоў Вы ўзначальваеце адну з вядучых ВНУ рэспублікі, прэстыж якой вельмі высокі сярод беларускай моладзі. Чым жа, на Ваш погляд, так прывабны эканамічны універсітэт, дзе ў апошнія гады конкурс абітурыентаў стабільна высокі?

— За апошняе дзесяцігоддзе колькасць вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі прыкметна павялічылася за кошт недзяржаўных ВНУ. Але не заўсёды гучная назва інстытута ці універсітэта, якія прапануюць моладзі сучасныя спецыяльнасці, адпавядае высокай якасці адукацыі. Наш жа універсітэт мае даўнія і заслужаныя традыцыі прэстыжнай навучальнай установы, дыплом якога высока цэніцца на рынку працы.

Сёння БДЭУ — шматпрофільная і шматузроўневая ВНУ, у сценах якой адначасова навучаецца больш за 20 тысяч студэнтаў на дзённай і завочнай формах. Ёсць 12 факультэтаў, Вышэйшая школа кіравання і бізнесу, Вышэйшая школа турызму, "Кансалтгандальцэнтр", Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі эканамічных кадраў, філіялы ў Бабруйску, Пінску, Маладзечне, Гродне. Навучанне студэнтаў і ўдасканаленне ведаў спецыялістаў вядзецца ў галіне эканомікі, кіравання і гаспадарчага права. За гады рэфармавання розных галін эканомікі істотна перагледжана структура спецыяльнасцяў і спецыялізацый. Значна пашырылася падрыхтоўка па знешнеэканамічнай і камерцыйнай дзейнасці, банкаўскай справе і фінансах, бухгалтарскім ўліку, аналізе і аўдыце. Адкрыта падрыхтоўка па маркетынгу, гаспадарчай справе, па прававым забеспячэнні знешнеэканамічнай дзейнасці, дзяржаўным і муніцыпальным кіраванні гасцінічнай і рэстараннай гаспадаркай, цэнаўтварэнні, рэкламнай дзейнасці, эканоміцы працы. Адпаведна з гэтымі пераўтварэннямі цалкам абноўлены вучэбныя планы і вучэбна-метадычная літаратура, выдадзены новыя падручнікі, якімі карыстаюцца студэнты эканамічных спецыяльнасцяў не толькі ВНУ рэспублікі, але і іншых краін СНД.

Для навучання нашых студэнтаў ёсць добрая матэрыяльна-тэхнічная база, абсталяваная сучаснай камп'ютэрнай тэхнікай, вучэбныя лабараторыі і аўтаматызаваныя рабочыя месцы на базе ПЭВМ для менеджэраў, фінансавых, банкаўскіх і камерцыйных работнікаў. Для вывучэння замежных моў абсталяваны спецыяльныя класы са спадарожнікавым тэлебачаннем і міжнароднай сеткай Інтэрнет. Ва універсітэце ёсць і свая карпаратыўная сетка. Для вучобы, заняткаў навуковай дзейнасцю, спортам, для культурнага правядзення вольнага часу моладзі створаны ўсе ўмовы. Навучанне вядуць высокакваліфікаваныя выкладчыкі з вялікім вопытам і стажам работы. Кожны навучальны семестр ва універсітэце са сваімі лекцыямі выступаюць і замежныя выкладчыкі, вучоныя з розных універсітэтаў свету.

— Наколькі нам вядома, БДЭУ — член Асацыяцыі еўрапейскіх універсітэтаў — вельмі актыўна шукае шляхі і магчымасці пашырэння сваіх замежных кантактаў і праграм. Што гэта дае самому універсітэту і яго выхаванцам?

— Ключавым напрамкам нашай міжнароднай дзейнасці стаў удзел у розных еўрапейскіх праграмах, правядзенне сумесных навуковых канферэнцый. Штогадова іх праходзіць не менш як 5-6, а геаграфія ўдзельнікаў пастаянна пашыраецца. Навуковыя канферэнцыі, безумоўна, даюць нашым вучоным не толькі найбагацейшы вопыт у той ці іншай эканамічнай галіне ведаў, але і магчымасць укараняць у навучанне новыя тэхналогіі, абнаўляць змест курсаў, мець непасрэдныя ўзаемны з замежнымі калегамі. Як вядома, навучальны працэс і навука — два складнікі паўнавартаснай дзейнасці ВНУ. Сучасная якасная і канкурэнтаздольная вышэйшая адукацыя магчыма толькі пры глыбокім веданні навуковых праблем, іх сістэмным вывучэнні. Без гэтага не можа быць бачных поспехаў у падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, уласных навуковых школ і, нарэшце, без гэтага немагчыма рыхтаваць кадры вышэйшай кваліфікацыі. Вучоныя універсітэта стараюцца быць на вастрыі навуковых сусветных праблем эканомікі. Цесныя сувязі мы падтрымліваем з многімі універсітэтамі свету — дагаворы заключаны з 35 ВНУ СНД, Азіі, Еўропы, ЗША, Канады.

Асабліва дынамічная работа праводзіцца ў рамках сумесных праектаў БДЭУ з Інстытутам кіравання прадпрыемствамі пры Сарбонскім універсітэце (Парыж) і універсітэтам Сэры (Вялікабрытанія), ТЭМПУС, якія спансіруюцца Еўрапейскай камісіяй. У рамках гэтых і іншых акадэмічных праграм толькі за мінулы навучальны год 207 выкладчыкаў універсітэта пабывалі за мяжой як удзельнікі навуковых канферэнцый, сімпозіумаў, як стажоры і непасрэдна па рабоце ў сумесных праектах. І ў нашых студэнтаў ёсць магчымасць прадоўжыць вучобу ці прайсці стажыроўку ў іншых краінах. Летась 96 студэнтаў вывучалі замежны вопыт у розных ВНУ Еўропы, Азіі і ЗША. Наш універсітэт імкнецца выкарыстоўваць атрыманы вопыт, веды, навуковыя распрацоўкі на карысць грамадства і для вырашэння тых эканамічных праблем, якія сёння стаяць перад нашай дзяржавай.

— Сённяшняя моладзь, як паказваюць апошнія сацыялагічныя апытанні, актыўна імкнецца да ведаў. Усё часцей нашы маладыя людзі выбіраюць ВНУ, дзе, з іх пункту гледжання, узровень якасці адукацыі асабліва высокі. Што, на Ваш погляд, сёння ўкладваецца ў паняцце "якасная адукацыя"? І як ВНУ імкнецца яе павысіць, каб адпавядаць рэаліям часу?

— Многія выпускнікі беларускіх ВНУ сёння годна канкуруюць на сусветных рынках працы са спецыялістамі, якія скончылі прэстыжныя універсітэты свету. Асабліва пераканаўча пацвярджаюць атрыманую якасць ведаў выпускнікі нашага факультэта міжнародных эканамічных адносін, якім часам лягчэй знайсці работу за мяжой, чым у нас у краіне. Крыўдна, канечне ж, што нашы адукаваныя выпускнікі пакідаюць краіну, але, думаю, гэта часовая з'ява.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта галоўнай сваёй задачай сёння бачыць павышэнне менавіта якасці адукацыі. Для гэтага істотна зменіўся як навучальны працэс, так і ўвогуле змест адукацыі. Яны накіраваны на павышэнне прафесійнай мабільнасці будучых спецыялістаў.

Павысіць якасць універсітэцкай адукацыі можна, з аднаго боку, за кошт абнаўлення яе зместу і выкарыстання інавацыйных адукацыйных тэхналогій, якія прадугледжваюць пашырэнне актыўных форм заняткаў і ўключэнне студэнтаў у навукова-даследчую дзейнасць. З другога боку — за кошт больш якаснага вучэбна-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу. І тое, і другое ў нашым універсітэце паспяхова ажыццяўляецца. Аб гэтым красамоўна сведчаць і лічбы — каля 80 працэнтаў студэнтаў ВНУ вучацца на "чатыры" і "пяць". 35-40 працэнтаў выпускнікоў атрымліваюць дыплом з адзнакай. Ужо з 1-2 курсаў многія студэнты актыўна займаюцца навукова-даследчай работай, з'яўляюцца пераможцамі як рэспубліканскіх конкурсаў, так і міжнародных.

— Як вядома, сёлета чакаецца напружаная прыёмная кампанія ў ВНУ рэспублікі, бо колькасць выпускнікоў сярэдніх школ будзе большай, чым у папярэднія гады. Наколькі сур'ёзны адбор абітурыентаў у БДЭУ?

— Правілы прыёму ва універсітэт агульнавядомыя. Недахопу ў абітурыентах мы ніколі не адчувалі. Да нас сапраўды прыходзіць пісьменная, падрыхтаваная моладзь, пераважна медалісты школ рэспублікі. Конкурс на асобныя спецыяльнасці асабліва высокі нават сярод медалістаў. Нязменнай папулярнасцю ў выпускнікоў карыстаюцца спецыяльнасці "знешнеэканамічная дзейнасць", "банкаўская справа", "гаспадарчая справа", "турызм", "маркетынг". Аднымі з першых мы ўвялі ўступны экзамен па замежнай мове, а цяпер большасць ВНУ рэспублікі ўзялі з нас прыклад. Жыццё пераканала, што веданне замежных моў неабходна сучаснаму спецыялісту, і сёння нашы студэнты вывучаюць іх на вельмі сур'ёзным узроўні.

Сёння вельмі важна знайсці шляхі спалучэння двух магутных відаў рэсурсаў дзяржавы — прыродных і інтэлектуальных — і ўмела выкарыстаць іх для вырашэння эканамічных і сацыяльных праблем грамадства. І гэта, на мой погляд, можна паспяхова рэалізаваць толькі праз развіццё навукі і адукацыі. Эканоміка ж будучыні — гэта эканоміка росту чалавечага патэнцыялу.

Антаніна КУЧКО.

Экалагічныя праекты

Жыццё працягваецца

Завяршыўся конкурс экалагічных праектаў, што праводзілі камітэт "Лебен нах Чарнобыль" (ФРГ) і Беларуска-германскае сумеснае дабрачыннае прадпрыемства "Надзея — XXI стагоддзе" сярод школ, якія накіроўваюць дзяцей на аздараўленне ў дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр "Надзея". У сёлетнім конкурсе экалагічных праектаў узялі ўдзел 13 школ. Ён праходзіў у два этапы.

На першым этапе школы рыхтавалі праекты, дзе былі адлюстраваны канкрэтныя прапановы па паляпшэнні экалагічнай сітуацыі ў мясцінах пражывання. Пяць каманд, якія прадставілі самыя цікавыя праекты, былі запрошаны ў цэнтр "Надзея" на другі этап конкурсу.

Не з вялікай радасці сучасныя дзеці займаюцца экалагічнымі праблемамі — тое, што павінна быць клопатам прафесіяналаў, стала клопатам кожнага з нас. Але ў гэтым наша выратаванне, калі з малых гадоў людзі пачнуць непакоіцца пра тое, каб берагчы свет і аднаўляць загубленае вандаламі. Стварыць вакол сябе асяродак экалагічна бяспечнага існавання — такая задача стаіць перад кожным, каму наканавана жыць у такім няпростым для планеты часе.

Заснавальнікі конкурсу экалагічных праектаў таксама мелі на мэце ўзмацненне матывацыі школьнікаў да практычных дзеянняў, скіраваных на паляпшэнне экалагічнай сітуацыі ў месцах іх пражывання. Ім было важна прыцягнуць увагу дзяцей да наступстваў чарнобыльскай катастрофы і актывізаваць асветніцкую работу на тэрыторыях, забруджаных радыенуклідамі. Не сакрэт, што людзі, жывучы там, часта пагарджаюць элементарнымі правіламі радыяцыйнай бяспекі. А школа здольная зрабіць (і робіць!) многае — даць не толькі веды, але і навучыць сваіх гадаванцаў беражліва ставіцца да жыцця свайго і сваіх блізкіх.

На другім этапе конкурсу свае экалагічныя праекты абаранялі каманды сярэдняй школы № 3 Быхава ("Насельніцтву і наваколлю — чыстую ваду"), Кочышчанскай сярэдняй школы Ельскага раёна ("Жыццё працягваецца"), сярэдняй школы № 2 Ельска ("Добраўпарадкаванне тэрыторыі школы"), Меркулавіцкай сярэдняй школы Чачэрскага раёна ("Стварэнне пладова-ягаднага саду "Мара" на базе школы") і гімназіі Добруша ("Шчыт здароўю, ці беражы здароўе з маладосці"). Апошняя каманда, дарэчы, стала пераможцай конкурсу экалагічных праектаў мінулага года.

Звярнулі на сябе ўвагу некалькі фактаў. Па-першае, з 13 каманд, што ўзялі ўдзел у конкурсе, толькі адну (Гараднянская сярэдняя школа Столінскага раёна) узначаліў настаўнік гісторыі, усе астатнія кіраўнікі каманд — біёлагі (не хімікі! не фізікі!). Па-другое (гэта на будучыню), і летась, і цяпер журы вітала ініцыятыву і актыўнасць пры абароне праектаў менавіта дзяцей. Калі раптам кіраўнік каманды выходзіў наперад, пацясніўшы сваіх вучняў, каб адказаць на пэўныя пытанні журы, ён тым самым адбіраў у сваёй каманды балы.

Прызавы фонд конкурсу эквівалентны чатыром тысячам нямецкіх марак. Абавязковай умовай для пераможцаў з'яўляецца выкарыстанне атрыманых прэмій для практычнай рэалізацыі іх праектаў. Улічваючы вопыт мінулага конкурсу (калі заслужаная прэмія каманды Краснапольскай сярэдняй школы № 2 была выкарыстана не па прызначэнні тымі, хто не меў да праекта аніякага дачынення), сёлета грошы будуць пералічваць камандам-пераможцам непасрэдна для мэтавага выкарыстання.

Дзіцячыя праекты далёка не навуковыя. Іх вартасць у тым, што кожны, хто ўзяў удзел у іх распрацоўцы (а хутка — і ў рэалізацыі), разважаў і шукаў сваё месца на сваёй зямлі. У камандах (а гэта — класы, гурткі) дзеці абмяркоўвалі экалагічныя праблемы тых мясцін, дзе яны жывуць, — забруджанне вады, глебы, паветра... У сваіх праектах яны абазначылі шляхі вырашэння некаторых з іх. І многае ўжо робяць сваімі рукамі.

Так, каманда-пераможца сярэдняй школы № 2 Ельска вызначыла асноўнымі мерапрыемствамі свайго праекта развіццё экалагічнага музея школы, азеляненне і аздабленне школьнай тэрыторыі, добраўладкаванне зялёнага класа, павелічэнне відавога складу школьнага дэндрарыя і г.д.

І нам трэба вучыцца ў нашых дзяцей — вырашэнне глабальных экалагічных праблем пачынаецца са свайго двара, раёна, горада... З крынічкі за ваколіцай і сада за акном... З клопату пра сваё здароўе і здароўе блізкіх. З экалагічных праектаў, якія, распрацаваўшы, трэба паслядоўна і мэтанакіравана рэалізоўваць.

Галіна СІДАРОВІЧ.

Могилевский педагогический колледж
объявляет

прием учащихся в 2001 году на дневное отделение по специальностям на основе базового образования: "Иностранный язык" (английский, немецкий).

на основе базового и общего среднего образования: "Педагогика и методика начального обучения", "Педагогика и психология дошкольная".

на заочное отделение: "Педагогика и психология дошкольная" — прием документов до 30 мая.

Справки по телефону: (8-022) 25-72-13.
Адрес: 212030, г. Могилев, ул. Комсомольская, 18.

Весткі з Барысава

Надзвычайная сітуацыя? Мы гатовы!

На наш погляд, даволі шырокі грамадскі рэзананс нядаўняга семінара-практыкуму для дырэктараў і начальнікаў штабоў грамадзянскай абароны школ Барысава, які прайшоў на базе сярэдняй школы № 13, заканамерны. Неабходнасць навучання дзеянням у любой надзвычайнай сітуацыі адмаўляць немагчыма. Разуменне дадзенай задачы педагогамі і вучнямі школы № 13 Барысава, якой кіруе Л.І.Гарнак, і было з поспехам прадэманстравана на гэтым мерапрыемстве.

Да семінара былі падрыхтаваны класныя гадзіны ў выглядзе ўрока-казкі "Здарэнне ў казачным доме", тэатра мініяцюр "Міністэрства надзвычайных сітуацый", літаратурна-музычнай кампазіцыі "Хто выратуе Зямлю?", вусных часопісаў "Незабыўнай ранай мне Чарнобыль баліць" і "Я б у пажарныя пайшоў...", інтэлектуальнай гульні "Тваё выратаванне — у тваіх руках". Вучні сярэдняга звяна школы наведалі кіналекторый "Надзвычайная сітуацыя ў тваім жыцці".

Але, мабыць, асабліва цікава дзецям было на больш рухавых мерапрыемствах, ва ўмовах экспромта, дзе адным з фактараў поспеху стала знаходлівасць. Зладжана дзейнічалі вучні ва ўмоўнай сітуацыі "Пажарная трывога", удала прадэманстравалі навыкі ў спаборніцтвах па пажарных відах спорту. Таксама цікава прайшлі спартыўныя спаборніцтвы "Вясёлыя старты". У імправізаваным палявым медпункце ўрач МНС і медсястра школы правялі практычныя заняткі па аказанні першай медыцынскай дапамогі з дзяўчатамі 9-11 класаў.

Палявая кухня, якую прывезлі вайскоўцы з батальёна РЭБ (в/ч Лядзішча), пакарміла дзяцей салдацкай кашай. Гэта экзотыка прыйшлася даспадобы ўсім хлопчыкам і дзяўчынкам.

Семінар-практыкум, падрыхтаваны з удзелам супрацоўнікаў МНС — пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада № 2, — завяршыўся "круглым сталом", на якім педагогі падвялі вынікі мерапрыемства.

Ахова правоў і інтарэсаў дзяцей

Паспяхова ў гэтым напрамку працуе педкалектыў школы № 8 Барысава (дырэктар З.С.Кранцэвіч), які знаёміць сваіх выхаванцаў з азамі юрыдычнай навукі. Набыты вопыт перадаецца калегам. Вось і нядаўна ў гэтай школе прайшоў гарадскі семінар для намеснікаў дырэктараў па выхаваўчай рабоце на тэму "Ахова правоў і інтарэсаў дзяцей — прыярытэтны аспект дзейнасці педагогаў".

У рамках мерапрыемства педагогі школы № 8 падрыхтавалі класныя гадзіны. З удзелам вучняў восьмых класаў настаўнікі правялі праблемна-пазнавальную гульню "Мае правы ў дзяржаве". Педагог Ж.В.Алай у выглядзе своеасаблівага практыкуму азнаёміла з нестандартнымі формамі правядзення бацькоўскіх сходаў.

Госці наведалі музеі школы "Спадчына" і "Гісторыя школы ў гісторыі краіны". Пры падвядзенні вынікаў семінара ўдзельнікі абмяняліся сваімі ўражаннямі.

Алена РАМАНАВА.

Барысаў.

Міжнародныя кантакты

Госці з Зялёнай Гуры

У Маскоўскім раёне сталіцы вялікая ўвага надаецца экалагічнай адукацыі моладзі. Яго адміністрацыя пастаянна дапамагае ажыццяўляць экалагічныя праекты. У рамках дзеючай ужо другі год беларуска-польскай адукацыйнай праграмы "Экалагічная школа будучыні", у якой удзельнічаюць вучні і настаўнікі Саюза экалагічных школ (СЭШ) з польскага горада Зялёна Гура і сярэдняя школа № 181 Мінска, у нашай сталіцы пабывала дэлегацыя польскіх настаўнікаў.

Сярэдняя школа № 181 у партнёры выбрана не выпадкова: на яе базе ўжо сёмы год паспяхова працуе экалагічнае грамадскае таварыства "Зялёны дуб". Зацікаўленасць і імкненне аказаць садзейнічанне ў распрацоўцы і ўкараненні новых адукацыйных тэхналогій у экалагічным навучанні і выхаванні школьнікаў праявілі намеснік кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна Н.М.Гардзяюк, загадчык аддзела па справах моладзі С.В.Кішко, дэпутат Палаты прадстаўнікоў А.В.Ваганаў, дэпутат Мінгарсавета Ю.П.Данькоў, генеральны дырэктар СП "Юніон мотарс" С.Э.Сцепанец.

Падчас перамоў зацверджана праграма правядзення "Зялёнай" і "Лясной" школ для вучняў СЭШ і сярэдняй школы №181. Вельмі цёпла прынялі польскіх гасцей у дэканаце і музеі геаграфічнага факультэта БДУ, з якім яшчэ ў 1998 годзе 181 школа заключыла дагавор аб стварэнні ліцэйскіх экалагічных класаў.

Польская настаўніцкая дэлегацыя пазнаёмілася з гістарычнымі і культурнымі помнікамі, музеямі Мінска, Заслаўля, Міра, Нясвіжа, наведала Хатынь, Раўбічы, пабывала на прадстаўленні "Містэрыя XXI стагоддзя" ў цырку, на спектаклі "Севастопальскі вальс" у тэатры музкамедыі.

Васіль КРАМІЧ.

Нетрадыцыйны педсавет

Свята розуму, душы і сэрца

Заканчваецца чарговы навучальны год. У каледжах, ліцэях, гімназіях, школах падводзяцца вынікі, ідзе падрыхтоўка да экзаменаў.

Наша сталічная гімназія №61 таксама ідзе ў нагу з жыццём пад кіраўніцтвам выдатнага педагога і кіраўніка Уладзіміра Канстанцінавіча Шчэрбы.

Мне хочацца расказаць пра апошні наш нетрадыцыйны педсавет, які адбыўся ў сакавіку. Распрацавала і праводзіла яго Лідзія Пятроўна Сярэдзіна, настаўнік вышэйшай катэгорыі, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце. За два месяцы да пачатку правядзення педсавета былі вызначаны задачы, пытанні для абмеркавання. У работу быў уключаны практычна ўвесь калектыў. Пад кіраўніцтвам намесніка дырэктара па навукова-метадычнай рабоце В.Л.Маеўскай прайшлі нетрадыцыйныя ўрокі, пазакласныя мерапрыемствы, фестывалі вопытных педагогаў, пазней — "маладых настаўнікаў", якія таксама паказалі ўменне выкарыстоўваць нетрадыцыйныя формы, новыя тэхналогіі на сваіх уроках.

Нашы паважаныя настаўнікі прынялі актыўны ўдзел разам са сваімі выхаванцамі ў раённых, гарадскіх конкурсах, фестывалях. Настаўнікам года стала Ларыса Аляксееўна Сідарэнка (1 кл.), выхавальнікам года — Валянціна Міхайлаўна Гутарава (5 кл.), пераможцай тэатральнага конкурсу — Інеса Анатольеўна Траскоўская (3 кл.). І дзеці, і педагогі паказалі сваё майстэрства, творчыя здольнасці, артыстызм!..

На пасяджэннях кафедраў была праведзена сур'ёзная работа. Напрыклад, на нашай, грамадска-гуманітарнай, настаўнікі арганізавалі выставу творчых работ, расказвалі аб стварэнні ўмоў для самарэалізацыі і самаразвіцця асобы на ўроках рускай і беларускай моваў. Асабліва хочацца спыніцца на выступленні настаўніцы беларускай літаратуры В.В.Саханькоўвай, якая расказала аб рабоце свайго этнаграфічнага кутка, яго ролі ў фарміраванні нацыянальных традыцый.

Закончылася пасяджэнне кафедры абмеркаваннем галоўнага пытання — "Які ён, вучань XXI стагоддзя?". Педагогі бачаць свайго вучня не толькі з багажом ведаў, але духоўна багатым, які ўмее самастойна мысліць, ацэньваць сітуацыю ў розных абставінах жыцця.

Уся гэта вялікая падрыхтоўчая работа вылілася ў нетрадыцыйны педсавет. Гэта было сапраўднае свята розуму, душы і сэрца. Усё было яму падпаракавана: цудоўны настрой па-веснавому апранутых настаўнікаў, кветкі, плакаты з выказваннямі, дыяграмы, выставы малюнкаў, творчых работ, гуказапіс фрагментаў адкрытых урокаў, інтэрв'ю са старшакласнікамі, кінафрагменты тэатральных выступленняў, справаздача куратараў пяці груп.

А частаванне беларускім караваем і салодкімі напоямі ў маленькіх перапынках ператварылася ў незвычайны фуршэт.

Усе пакідалі мерапрыемства з жаданнем працаваць яшчэ лепей, шукаць шляхі для павышэння свайго педагагічнага майстэрства.

Галіна ЯЦЫШЫНА,
настаўніца гімназіі № 61
Мінска.

Прафесійна-тэхнічная адукацыя: дзень сённяшні

Калі да справы падыходзіць творча

У працэсе рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі па развіцці прафесійна-тэхнічнай адукацыі з улікам патрабаванняў сацыяльна-эканамічнага комплексу рэспублікі ўзмацняецца сёння і роля Рэспубліканскага Савета дырэктараў прафесійна-тэхнічных устаноў, які ўзначальвае дырэктар Мінскага вышэйшага прафесійнага вучылішча электронікі Валерый Хасін.

Трэба канстатаваць, што дзейнасць названага аб'яднання найбольш актывізавалася апошнім часам і набыла новыя, больш эфектыўныя накірункі ўзаемадзеяння як з навучальнымі ўстановамі, так і з кіруючымі структурамі адукацыі. На гэты раз члены Рэспубліканскага Савета былі гасцінна прыняты на Гродзеншчыне. У рабоце пасяджэння бралі ўдзел першы намеснік міністра адукацыі Барыс Іваноў, начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай адукацыі Міністэрства адукацыі Эдуард Ганчар, прарэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Міхаіл Ільін, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыя Бірукова, начальнік упраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Гаўрон, намеснік начальніка гэтага ж упраўлення Іван Урбановіч, а таксама намеснікі начальнікаў упраўленняў адукацыі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

Вясна пачынаецца з Гродна

Былі толькі першыя майскія дні, а на Гродзеншчыне буяла вясна. Кружыла імкліва пялёсткамі кветак бела-ружовая завея. Насычанае яе непаўторным водарам паветра, як звонкі крышталь, зіхацела пад сонечнымі промнямі. Сагрэтая і аблашчаная імі зямля нараджала маладую, пяшчотную зеляніну, абяцаючы ў будучым новы ўраджай, а руплівыя земляробы даўно па-гаспадарску завіхаліся на палетках і беражліва даглядалі першыя трапяткія парасткі руні. Звычайна Гродзеншчына першай сустракае вясну. А тая быццам імкнецца выпрабаваць яе жыхароў на працоўную трываласць. Ды толькі гэтая рыса стала для гродзенцаў ужо спадчыннай. Пра тое сведчыць і слаўная гісторыя Гродзенскай губерні, 200-годдзе якой адзначаецца сёлета. Карані самаадданай працавітасці і гаспадарлівасці, таленту і творчасці здаўна прыняліся ў зямлі гэтага краю. Яшчэ на пачатку існавання Гродзенскай губерні карысталіся вялікім попытам рамесныя паслугі знакамітых майстроў, славіліся вырабы ткачоў, шкляроў, ювеліраў. Іхняя работа вызначалася высокай якасцю і тонкім густам. Некаторыя гродзенскія мануфактуры выпускалі такія прадметы раскошы, якія набывалі спажыўцы з... царскага двара.

Прызнанне гэтай якасці захавалася на вякі. З пакалення ў пакаленне перадаюцца сакрэты прафесійнага майстэрства, якое вынікае з адданасці любімай справе і творчага ўздыму. Яны і сёння даюць той магутны імпульс, які дазваляе Гродзеншчыне рухацца па шляху ўдасканалення, новых адкрыццяў і пачынанняў.

У парадак дня пасяджэння Савета ўвайшлі пытанні распрацоўкі, прыняцця і выканання праграм развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі абласцей рэспублікі і г.Мінска, прымянення інфармацыйных тэхналогій у працэсе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных рабочых і спецыялістаў, пашырэння шматфункцыянальнасці і шматпрофільнасці навучальнай установы, а таксама прадпрымальніцтва як фактара трансфармацыі прафесійнай адукацыі і арганізацыйных асноў дзейнасці калектыву ПТВ па выкананні праграмы развіцця прафтэхадукацыі Гродзенскай вобласці.

Праграма развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі кожнай вобласці і г.Мінска ставіць мэтай рэалізацыю намечаных пераўтварэнняў, якія накіраваны на фарміраванне даступнай, адкрытай, бесперапыннай адукацыі. Яна павінна забяспечыць высакаякасную падрыхтоўку спецыялістаў для рынку працы, аператыўна ўлічваючы яго попыт, удасканальваць прафесійнае майстэрства, развіваць асобу навучэнца. Намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Іван Урбановіч прадставіў грунтоўную, прадуманую праграму развіцця ПТА рэгіёна, у якой падрабязна ахарактарызаваны стан і выкладзены перспектывы развіцця прафтэхадукацыі вобласці, азначаны шляхі ўдасканалення структуры ПТА, арганізацыі і зместу вучэбна-выхаваўчага працэсу, разгледжана пытанне кадравага забеспячэння прафтэхадукацыі Гродзеншчыны.

Так, сістэма ПТА рэгіёна ўключае 30 навучальных устаноў, дзе атрымліваюць адукацыю па 104 прафесіях больш як 16 тысяч чалавек. Штогод выпуск маладых спецыялістаў складае каля 6 тысяч, якія накіроўваюцца на прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу, прамысловай вытворчасці, будаўніцтва, бытавога абслугоўвання насельніцтва, гандлю і грамадскага харчавання.

Вучэбна-выхаваўчы працэс ажыццяўляецца вопытнымі выкладчыкамі і майстрамі вытворчага навучання, якія заўсёды маюць магчымасць павысіць сваю кваліфікацыю ў філіяле кафедры Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, што адкрыты на базе Гродзенскага абласнога вучэбна-метадычнага цэнтра прафесійнай адукацыі. Зараз у прафсістэме задзейнічана 1780 кіруючых і інжынерна-педагагічных работнікаў. Але з-за нізкай заработнай платы, праблем сацыяльнага характару па-ранейшаму захоўваецца высокая цякучасць кадраў. На жаль, напаўняльнасць калектываў ПТНУ маладымі спецыялістамі вельмі нязначная. Існуюць праблемы і з перыядычнасцю павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў.

Матэрыяльна-тэхнічная база навучальных устаноў ПТА знаходзіцца сёння ў працэсе пераабсталявання і абнаўляецца, у асноўным, за кошт пазабюджэтных сродкаў. Напрыклад, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ПТНУ было выдаткавана ў мінулым годзе 72.506 тысяч рублёў з фінансавых паступленняў ад вучэбна-вытворчай дзейнасці вучылішчаў. За кошт фонду стабілізацыі эканомікі вытворцаў сельгаспрадукцыі і харчавання вобласці былі набыты новыя трактары. А з абласнога бюджэту паступілі сродкі для закупкі камп'ютараў, дапаможнікаў па агульнатэхнічных дысцыплінах. Упраўленне адукацыі аблвыканкама робіць іншыя захады па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ПТНУ.

Сістэма ПТА Гродзеншчыны арыентуе сваю дзейнасць на шырокапрофільнасць і шматфункцыянальнасць падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў, што забяспечвае надзейнасць у сацыяльнай абароне выпускнікоў.

Больш паловы навучальных устаноў ПТА працуюць у рэжыме шматпрофільнасці, а 77 працэнтаў выпускнікоў атрымліваюць дзве і болей прафесіі. 230 навучэнцаў навучаюцца ў ліцэйскіх групах. Яны праходзяць агульнаадукацыйную падрыхтоўку па профільных прадметах на павышаным узроўні ў Ашмянскім ПТВ № 192, Слонімскім дзяржаўным сельскагаспадарчым прафесійным ліцэі і Гродзенскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы прыбораабудавання.

З улікам рэгіянальнай неабходнасці ў рабочых кадрах высокай кваліфікацыі і попыту базавых прадпрыемстваў у спецыялістах сярэдняга звяна чатыры прафтэхвучылішчы ператвораны ў навучальныя ўстановы, дзе адукацыя ажыццяўляецца па дзвюх ступенях. Акрамя рабочай прафесіі, можна атрымаць сярэднюю спецыяльную адукацыю ў Гродзенскім дзяржаўным прафесійным электратэхнічным каледжы імя І.Шчаснага, Гродзенскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы лёгкай прамысловасці, Гродзенскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы прыбораабудавання, Гродзенскім дзяржаўным вышэйшым прафесійным вучылішчы хімічнай прамысловасці. Дванаццаць устаноў ПТА ажыццяўляюць бесперапынную адукацыю па сістэме ПТНУ — ССНУ — ВНУ.

На Гродзеншчыне створаны і вынікова працуе шэраг рэгіянальных цэнтраў па дапрафесійнай падрыхтоўцы школьнікаў і прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі рабочых кадраў, навучанні беспрацоўных.

Дзейнасць ПТНУ Гродзенскай вобласці накіравана на развіццё асобасна-арыентаванай выхаваўчай работы, мэта якой — выхаванне гарманічнай асобы, стварэнне ўмоў для рэалізацыі творчых здольнасцяў навучэнцаў, падрыхтоўкі іх да самастойнага жыцця і адаптацыі ў грамадскім асяроддзі. Для гэтага ва ўстановах ПТА распрацаваны адмысловыя праграмы.

Сацыяльная функцыя прафтэхадукацыі вобласці знаходзіцца ў стадыі ўдасканалення. У ПТНУ навучаюцца дзеці-сіроты і дзеці без бацькоўскага апякунства, з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця, інваліды, перасяленцы з зон радыяцыйнага забруджання. Яны акружаны ўвагай і клопатам з боку работнікаў навучальных устаноў.

Адбываюцца і станоўчыя зрухі ў працоўным уладкаванні выпускнікоў. У 2000 годзе ўзровень іх агульнай занятасці склаў амаль 84 працэнты.

Трэба адзначыць, што рэалізацыя асноўных накірункаў развіцця сістэмы ПТА Гродзенскай вобласці прадугледжвае шчыльнае ўзаемадзеянне яе з эканамічным комплексам рэгіёна па праблеме падрыхтоўкі рабочых кадраў, стварэнні рацыянальнай сеткі ўстаноў па прагназаванні рынку працы, забеспячэнні пераемнасці адукацыі. З гэтай мэтай галоўнымі задачамі ПТА вобласці павінны стаць новыя падыходы ў праектаванні адукацыйнага зместу, удасканаленне навуковага і метадычнага забеспячэння, сучаснае абсталяванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, ажыццяўленне дзейсных захадаў па кадравым укамплектаванні прафтэхустаноў.

Кветкавы баль

У той дзень сабраліся ва ўсёй красе вясновыя кветкі, каб уразіць усіх сваімі яркімі фарбамі, зграбнымі станамі, грацыяй. Толькі дэфелявалі яны на гэты раз на подыуме Гродзенскага прафесійна-тэхнічнага каледжа лёгкай прамысловасці, бо былі яны... навучэнкамі. Якіх толькі мадэляў не дэманстравалі дзяўчаты! Вось серыя белых сукенак нагадвае майскія яблыні ў квецені, а вось — строгія, дзелавыя касцюмы для рабочых сустрэч, лёгкія, летуценныя ўбранні для адпачынку. Фасоны такія, што, здаецца, няма мяжы фантазіі! А яна, як вядома, крочыць поруч з творчасцю. Менавіта гэтыя рысы характэрныя знакамітаму "Тэатру моды", дзе сабраліся аднадумцы, апантаныя творчым палётам.

Гэтаму тэатру толькі сем гадоў, але маё ён багатую на падзеі біяграфію. Удзел у вядомых конкурсах мадэляў "Белая Амфара", "Млын моды-2001", "Рускі сілуэт", паказы моды на прадпрыемствах горада і за яго межамі, у калгасах і саўгасах Гродзеншчыны прынеслі тэатру вялікую папулярнасць. Але за ёю стаіць цяжкая, напружаная праца ўсяго калектыву каледжа, якая складаецца з дзейнасці факультатываў "Гісторыя касцюма", "Канфекцыянер", "Канструктар", "Тэхнолаг", гуртка "Спадчына" швейных майстэрняў.

Сёння каледж узначальвае Вячаслаў Хмяльніцкі, чалавек самаадданы, энергічны, яму падуладна любое пачынанне. Зараз ва ўстанове навучаецца каля 800 чалавек на трох аддзяленнях: эканамічным, швейным і тэкстыльным. У час навучання выхаванцы каледжа засвойваюць бухгалтарскі ўлік, маркетынг, менеджмент, асновы эканомікі і бізнесу, эканамічны аналіз, вывучаюць абсталяванне і тэхналогію швейнай і тэкстыльнай вытворчасці, мадэляванне і канструяванне, а таксама асновы права і практычнай псіхалогіі, экалогію, дзелавую замежную мову.

Вучэбна-выхаваўчы працэс ажыццяўляецца на добра абсталяванай матэрыяльнай базе, якая складаецца са швейных і тэкстыльных майстэрняў, кабінета сацыяльна-псіхалагічнай службы, метадычнага і інш. Ёсць і два камп'ютарныя класы.

Створаны таксама добрыя ўмовы для развіцця культурнага, фізічнага, творчага патэнцыялу выхаванцаў. Гэтаму спрыяюць асобасна-арыентаваны падыход, праблемна-развіваючае навучанне, а таксама педагогіка супрацоўніцтва.

Акрамя знакамітага "Тэатра Моды" у каледжы паспяхова дзейнічаюць 22 факультатывы, 2 гурткі мастацка-прыкладной і тэхнічнай творчасці "Кветкавы дызайн" і "Спадчына", 10 гурткоў па прадметах і 6 спартыўных секцый, Народны ансамбль песні і танца, клуб ЮНЕСКО.

Заслугоўвае самай высокай ацэнкі калектыў установы, у склад якога ўваходзяць вопытныя, спрактыкаваныя выкладчыкі і майстры вытворчага навучання, якія перадаюць свае веды і ўменні выхаванцам. А выпускнікі ўстановы заваявалі добрую рэпутацыю на рынку працы. Іх высакаякасная падрыхтоўка станоўча ацэньваецца як на прадпрыемствах лёгкай прамысловасці любых формаў уласнасці, так і ва ўстановах ды арганізацыях горада і вобласці. Многія былыя навучэнцы каледжа паспяхова працягваюць сваю вучобу ў ВНУ.

У працэсе высакаякаснай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў значная ўвага надаецца карыстанню інфармацыйнымі тэхналогіямі, што дапамагае засвоіць у поўным аб'ёме не толькі агульнаадукацыйныя і прафесійныя веды, але і атрымаць неабходныя навыкі інфармацыйнай культуры.

Адпаведна гэтаму для навучэнцаў эканамічнага аддзялення каледжа праводзіцца навучанне па спецыяльнасці "Інфармацыйнае і арганізацыйнае абслугоўванне".

Удзельнікі пасяджэння мелі магчымасць пазнаёміцца з працэсам навучання на ўроку прыкладной інфарматыкі першага курса эканамічнага аддзялення ў лабараторыі інфармацыйных тэхналогій. Навучэнцы замацоўвалі тэарэтычныя веды і атрымлівалі навыкі інфармацыйнай культуры, важнейшым аспектам якой з'яўляецца ўменне здабываць інфармацыю са шматлікіх крыніц, прадстаўляць яе ў зразумелым выглядзе і ўмець эфектыўна выкарыстоўваць.

Інфармацыйныя тэхналогіі ўжываюцца не толькі пры падрыхтоўцы спецыялістаў інфармацыйнага і арганізацыйнага абслугоўвання, а і на іншых аддзяленнях навучання па прадметах спецтэхналогій і агульнаадукацыйнага цыкла.

Такі вопыт работы быў прадстаўлены на ўроку па канструяванні адзення ў групе швейнага аддзялення.

У швейнай прамысловасці сёння выкарыстоўваюцца многія сістэмы аўтаматычнага праектавання, адной з якіх з'яўляецца праграма "Аўтакрой". Яна дазваляе распрацоўваць базавыя і мадэльныя канструкцыі, а таксама лякалы мадэлі па зададзеным эскізе. Дзякуючы гэтай сучаснай праграме навучэнцы выкарыстоўваюць у сваёй рабоце прагрэсіўныя метады швейнай вытворчасці, якія дазваляюць скараціць час на падрыхтоўку мадэлі да пашыву, павысіць якасць і прадукцыйнасць працы.

Вучэбная праграма "Аўтакрой" прыдатная для работы гурткоў і факультатываў. Акрамя таго, было наглядна прадэманстравана ўдзельнікам пасяджэння Рэспубліканскага Савета дырэктараў выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у рабоце сацыяльна-псіхалагічнай службы, у выкладанні агульнаадукацыйных дысцыплін, былі прадстаўлены тэлекамунікацыйныя сеткі і інтэграцыйныя працэсы інфармацыйных тэхналогій.

У каледжы ўсебакова вывучаецца тэхналогія адукацыйнага працэсу Мінскага прадстаўніцтва Сучаснага гуманітарнага інстытута і, у прыватнасці, тэхналогія дыстанцыйнага навучання, якое можна выкарыстоўваць у працэсе падрыхтоўкі завочнікаў.

У праграме развіцця Гродзенскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа лёгкай прамысловасці закладзены асноўныя палажэнні інфарматызацыі вучэбнага працэсу, адно з якіх прадугледжвае фарміраванне новага структурнага падраздзялення — інфармацыйнага цэнтра. Гэта, безумоўна, адкрые новыя перспектывы па выпрацоўцы сістэмных падыходаў у кіраванні якасцю адукацыі на абноўленай інфармацыйнай базе.

Служба быту — служба добрага настрою

Шлях да рэалізацыі патрабаванняў асобы, грамадства і дзяржавы ў атрыманні адукацыйных паслуг стаў асноўным у дзейнасці Гродзенскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 74 бытавога абслугоўвання насельніцтва, дырэктарам якога працуе дзелавы, ініцыятыўны кіраўнік Васіль Міхно.

Гэтая ўстанова — яшчэ адна слаўная старонка прафтэхадукацыі Гродзеншчыны. Створанае 35 гадоў назад, вучылішча прыступка за прыступкай набірае сучасны тэмп, імкнучыся да вяршыняў прафесійнага майстэрства. Багаццем установы лічыцца яе калектыў, дзе працуюць сапраўдныя педагогі, майстры сваёй справы, творчыя людзі. Своеасаблівым прызнаннем натхнёнай работы інжынерна-педагагічнага калектыву можна лічыць той факт, што вучылішча з'яўляецца пастаяннай творчай пляцоўкай для правядзення рэспубліканскіх, абласных семінараў. У скарбонцы вучылішча беражліва захоўваюцца шматлікія ўзнагароды, атрыманыя навучэнцамі на разнастайных конкурсах, аглядах, на выставах і спартакіядах.

Зараз навучанне ў вучылішчы праходзіць па трох накірунках. Тут можна атрымаць прафесіі на цырульніцкім, швейным і абутковым аддзяленнях.

Большасць прафесій ва ўстанове з'яўляюцца інтэграванымі альбо сумешчанымі. Асноўная частка выпускнікоў атрымлівае адначасова дзве прафесіі з кваліфікацыйным разрадам па кожнай з іх. Зараз праходзяць навучанне па прафесіі абутнік навучэнцы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Ва ўстанове таксама навучаюцца дзеці-сіроты, дзеці з мнагадзетных і няпоўных сем'яў, якія знайшлі свой родны дом у вучылішчы.

У апошні час узрастае роля ўстановы ў вырашэнні праблемы працоўнай занятасці насельніцтва. Так, па заяўках службы занятасці штогод тут вучыцца каля ста чалавек. а выпуск кваліфікаваных рабочых кожны год складае амаль 300 чалавек.

Установа ў поўным аб'ёме забяспечвае патрэбы сферы бытавога абслугоўвання ў высокакваліфікаваных спецыялістах, і ў першую чаргу базавых прадпрыемстваў: знакамітых швейна-гандлёвай фірмы "Элод", фабрыкі мастацкіх вырабаў "Сузор'е", вытворчага аб'яднання "Гроднааблбыт", арэндна-вытворчага прадпрыемства "Радуга".

Патрабаванні ў базавікоў да свайго кадравага саставу сёння вельмі высокія: прафесіяналізм і адаптаванасць у сацыяльнай сферы, такт, уважлівасць, індывідуальны падыход ва ўзаемінах, творчасць, ініцыятыўнасць і высокая ступень адказнасці на рабочым месцы.

Пра тое, што выпускнікі ПТВ № 74 адпавядаюць запытам рынку працы, сведчыць добры паказчык іх працаўладкавання: у 2000 годзе ён наблізіўся да 80 працэнтаў.

Многія выпускнікі працягваюць сваё навучанне ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах, каб зноў жа вяртацца на працу ў службу бытавога абслугоўвання насельніцтва і дарыць людзям радасць. Магчыма, з такімі спецыялістамі служба быту стане службай добрага настрою.

Фермерскі "Верас"

Сярод бязмежнага абсягу палёў размясцілася на пагорку невялікая гаспадарка. Забудоў няшмат: двухпавярховы дом, хлявы, склады, сховішчы. А вакол — прыгожы сад: маладыя яблынькі месяцца разам з экзатычнымі дрэўцамі і кустамі. На акуратна дагледжаных градах высаджана капуста, цыбуля, іншая гародніна. Далей — дзесяткі гектараў ворыва. Не верыцца, што ўся гэтая гаспадарка належыць аднаму чалавеку, маладому фермеру М.Макею, які жыве тут з сям'ёй.

Апрацоўваць уласную зямлю на такой вялікай плошчы яму аднаму, безумоўна, не пад сілу. Таму выкарыстоўваецца, як звычайна ў фермерстве, наёмная праца. Эканамічнымі пытаннямі, як і бухгалтарскім улікам, фермер займаецца сам. Прыйшлося заняцца пашырэннем ведаў і па раслінаводству. Праўда, жывёлагадоўля застаецца пакуль задумай на бліжэйшую перспектыву. У планах таксама — павелічэнне машынна-трактарнага парка, асваенне новых відаў агародніны і садавіны. Ды і праблем нямала. Фермерства ў Беларусі пакуль знаходзіцца, на жаль, толькі ў зародкавым стане. Вопыту такога кшталту зусім мала. Бадай, яго не стала больш, як і дзесяць гадоў назад, калі М.Макей вырашыў стаць уласнікам аднаго з горшых, пясчаных, участкаў калгаснай зямлі. Многія прадказвалі яму няўдачу і правал. Але ж улюбёны ў зямлю чалавек заўсёды знойдзе паразуменне. Зараз падзвіцца на гаспадарскую кемнасць М.Макея прыязджаюць з усёй рэспублікі. А ў фермерства ёсць будучыня. Нездарма ж наш герой назваў сваю гаспадарку "Верасам". Гэта — вечназялёная, неўміручая расліна.

Апраўданы пошук

У час пасяджэння Савета дырэктараў ПТНУ рэспублікі была шырока прадстаўлена дзейнасць адной са знакамітых прафтэхустаноў Гродзеншчыны — Слонімскага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя. Доўгі час яго ўзначальвае таленавіты арганізатар, сучасны гаспадарнік Аляксандр Кароль.

Удзельнікі сустрэчы азнаёміліся з асноўнымі накірункамі праграмы развіцця гэтай установы на бліжэйшы час. У ёй галоўны акцэнт зроблены на ажыццяўленне падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых і спецыялістаў на аснове дагаворных пагадненняў з работадаўцамі з улікам балансу размеркавання моладзі па каналах далейшага навучання і працаўладкавання, на забеспячэнне сацыяльных гарантый, садзейнічанне ўсебаковаму развіццю асобы навучэнцаў, стварэнне эфектыўных механізмаў узаемадзеяння ліцэя з галінамі аграпрамысловага комплексу.

Сёння ва ўстанове навучаецца больш сямісот чалавек па дзвюх асноўных прафесіях: майстар сельскагаспадарчай вытворчасці і гаспадыня сядзібы. Акрамя гэтага ў ліцэі ажыццяўляецца паглыбленая падрыхтоўка навучэнцаў па матэматыцы і фізіцы, што адкрывае перспектывы для паступлення ў навучальныя ўстановы больш высокага ўзроўню. Адметна, што толькі ў мінулым годзе 20 чалавек паступілі ў ВНУ, а 14 — у тэхнікумы.

Неаднаразова выхаванцы гэтага ліцэя славілі сваю ўстанову перамогамі на алімпіядах, прафесійных конкурсах, аглядах мастацкай самадзейнасці, выставах тэхнічнай і мастацкай творчасці.

І, безумоўна, гэты поспех складваецца з творчых здабыткаў, багатага вопыту, педагагічнага майстэрства калектыву ліцэя, дзе працуюць 33 выкладчыкі і 45 майстроў вытворчага навучання, якія пастаянна займаюцца ўдасканаленнем вучэбна-выхаваўчага працэсу, у аснову якога закладзена рэалізацыя асобасна-арыентаванага падыходу, узаемадзеянне педагагічных работнікаў, навучэнцаў, іх бацькоў, сацыяльных партнёраў, укараненне інфармацыйных і камунікатыўных тэхналогій.

У працэсе ўкаранення гнуткіх форм арганізацыі вучэбнага працэсу ва ўстанове выкарыстоўваецца чаргаванне тэарэтычнага і практычнага навучання. Апошняе праводзіцца на вытворчасці, у вучэбна-вытворчых майстэрнях і на іншых аб'ектах. Гэтаму спрыяе сучасная, добра абсталяваная матэрыяльна-тэхнічная база ліцэя. Яна ўключае 10 кабінетаў па агульнаадукацыйных прадметах, 12 — па спецыяльных, 7 вучэбных лабараторый, камп'ютарны клас. Для правядзення практычных заняткаў па вытворчым навучанні тут ёсць аўтатрактарадром, слясарная майстэрня, вучэбна-вытворчая майстэрня па рамонту і тэхнічным абслугоўванні аўтатрактарнай тэхнікі, дзве лабараторыі трактараў, дзве лабараторыі сельгасмашын, лабараторыя экскаватараў, электра- і газазварачны клас, 160 адзінак сельскагаспадарчай тэхнікі.

Адметнае месца ў вытворчым навучанні ліцэя займае вучэбная гаспадарка. Яна раскінулася на плошчы ў 590 гектараў. Плошча пасеву збожжавых культур складае 265 гектараў. Ураджайным быў мінулы год. Зерня было сабрана па 35 цэнтнераў з аднаго гектара, што ўвогуле дало ўражальны вынік — 1.000 тон.

Ёсць у вучэбнай гаспадарцы і жывёлагадоўчая ферма, дзе знаходзяцца на адкорме сёння 150 галоў цялят.

Як зерне, так і жывёлу ліцэй прадае дзяржаве і мае неблагі прыбытак. Так, агульная сума прыбытку склала ў мінулым годзе больш 108 мільёнаў рублёў. Атрыманыя фінансавыя сродкі па-гаспадарску выкарыстоўваюцца для абнаўлення вучэбнай базы. Апошнім часам установай набыты новы трактар, капалка. Плануецца пабудаваць зернесклад і бульбасховішча. Пазабюджэтныя сродкі выдзяляюцца ў значнай колькасці і для матэрыяльнага заахвочвання работнікаў ліцэя і навучэнцаў.

Асноўнымі фактарамі паспяховага развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў Слонімскім сельскагаспадарчым прафесійным ліцэі з'яўляюцца абнаўленне падыходаў да праектавання яе зместу, удасканаленне навуковага і метадычнага забеспячэння, работа па кадравым забеспячэнні ўстановы.

Як паказаў аналіз, поспех дзейнасці прафтэхустаноў Гродзенскай вобласці гарантаваны дальнабачнай палітыкай Гродзенскага аблвыканкама ў галіне адукацыі, цесным узаемадзеяннем упраўлення адукацыі з суб'ектамі гаспадарання па пытанні забеспячэння рэгіёна і яго сацыяльна-эканамічнага комплексу кадравым саставам рабочых і спецыялістаў.

Прафтэхустановы рознага тыпу, прадстаўленыя ў час работы Рэспубліканскага Савета, маюць свае асаблівасці ў рэалізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу, але іх дзейнасць прасякнута аднымі дзяржаўнымі задачамі, якія акрэслены ў Канцэпцыі і Праграме развіцця айчыннай прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Дзякуючы творчым памкненням і самаадданасці кіраўнікоў і іх калектываў гэтыя ўстановы знаходзяцца ў пастаянным пошуку самых аптымальных шляхоў у ажыццяўленні высакаякаснай падрыхтоўкі маладых спецыялістаў з улікам тых патрабаванняў, якія прад'яўляюць сёння наша грамадства і эканоміка. І пошук гэты, як бачна на вопыце, сябе апраўдвае.

Ала КЛЮЙКО.

У рэжыме эксперыменту

Школа ў Арэхаўскім

Вось ужо васемнаццаць год Арэхаўскую сярэднюю школу Кобрынскага раёна, пабудаваную ў 1983 годзе, узначальвае Яраслаў Аляксандравіч Клачковіч. Практычна нязменны і настаўніцкі калектыў. Гэта натуральна, таму што ўсе педагогі — мясцовыя жыхары. Школа ў Арэхаўскім — адзіная ў вобласці сельская агульнаадукацыйная ўстанова, якая працуе ў рэжыме эксперыменту. У ім задзейнічана прыблізна 2/3 настаўнікаў. І калі на пачатку новаўвядзення адчуваліся насцярога і недавер педагогаў, бацькоў, то сёння, праз тры гады, усё ўжо ззаду. У мінулым годзе з 41 выпускніка ў вышэйшыя навучальныя ўстановы з Арэхаўскай сярэдняй школы паступілі дзесяць хлопцаў і дзяўчат, астатнія — хто ў сярэднія спецыяльныя, хто пайшоў працаваць.

У год адкрыцця ў сельскай школе было толькі 68 вучняў, пік навучэнцаў у колькасным эквіваленце склаў 420 чалавек. Сёння ў школе вучыцца толькі 260 хлопчыкаў і дзяўчынак... Выходзіць, дэмаграфічны крызіс, які, паводле прагнозаў спецыялістаў, чакаецца праз два гады, ужо закрануў гэтую ўстанову. З кожным годам усё менш першакласнікаў садзяцца за парты, больш і больш маладых людзей пакідае сяло.

Хто ж будзе вучыць дзяцей, дый хто будзе вучыцца, калі праз колькі год сённяшнія сельскія настаўнікі пойдуць на заслужаны адпачынак, а на вёсцы застануцца адны толькі старыя?

У пасёлку Арэхаўскім усе настаўнікі перакананы, што вырашыць гэтую праблему можа толькі дзяржава. Калі будзе будавацца жыллё для маладых спецыялістаў, больш высокім стане сацыяльны статус настаўніка, то з'явяцца перспектывы і ў жыццядзейнасці школы.

Вольга ДУБОВІК.

НА ЗДЫМКАХ: цікава на ўроку біялогіі, які вядзе Таццяна Аляксандраўна Клачковіч; кіраўнік гуртка графікі "Я і свет вакол мяне" Ніна Андрэеўна Крыжаноўская са сваімі выхаванцамі; настаўніца беларускай мовы і літаратуры Людміла Іосіфаўна Гарыст праводзіць заняткі ў школьным этнаграфічным музеі.

Фота Юрыя БОНДАРАВА.

За мяжой

І пасля бурнай ночы...

Студэнты фізіка-матэматычнага факультэта Шаўляйскага універсітэта Літвы ўпэўнены, што шпаргалка, зробленая імі, з'яўляецца самай доўгай у свеце. "Падказка" даўжынёй больш за 600 метраў была працягнута ад студэнцкага інтэрната да цэнтральнага будынка універсітэта.

У рабоце па склейванні рэкорднай шпаргалкі былі заняты 68 будучых матэматыкаў і фізікаў. Напружаная праца безупынна працягвалася 16 гадзін. Збіраць фрагменты шпаргалкі пачалі з першых дзён сёлетняга навучальнага года.

Дэкан фізіка-матэматычнага факультэта, прафесар Альфрэдас Ланкаускас, прымаючы гэты "падарунак" ад студэнтаў, адзначыў, што "шпаргалкі — непазбежны і неабходны атрыбут студэнта". Прафесар прызнаўся, што і сам у студэнцкія гады часта звяртаўся за дапамогай да "тайных падказак".

Аднак дэкан факультэта заклікаў будучых фізікаў і матэматыкаў не часта карыстацца імі, бо, як ён сказаў, "вашы галовы яны не ўзбагацяць ведамі". Студэнты паабяцалі, што да падказак яны будуць звяртацца толькі ў трох выпадках: калі выкладчык падчас экзаменаў ужо "вельмі дакучае сваімі пытаннямі", калі прадмет асабліва цяжкі і... пасля бурна праведзенай ночы.

Самая доўгая шпаргалка шаўляйскіх студэнтаў была занесена ў Кнігу рэкордаў Літвы.

Падрыхтаваў Ігар КАНДРАЛЬ.

Сёння — Дзень фізічнай культуры і спорту

Стадыён

Фізкультурна - спартыўны выпуск "НГ"

Скажу добрае слова

Справа яго жыцця

Няпроста знайсці словы, каб выказаць захапленне сціплым чалавекам, таленавітым педагогам-гуманістам Мікалаем Іванавічам Гутнікавым, настаўнікам фізічнай культуры Пакалюбіцкай сярэдняй школы Гомельскага раёна. У працоўнай кніжцы М. Гутнікава у звестках аб прыёме на работу толькі адзіны запіс, хаця стаж яго педагагічнай дзейнасці — амаль 50 гадоў. Паўвека ў адной школе, на адной працы. Настаўнік рыхтуецца адзначыць свой 70-гадовы юбілей. Тым не менш Мікалай Гутнікаў і сёння ў страі, з поспехам працягвае займацца са сваімі вучнямі. А метадычныя распрацоўкі выдатніка адукацыі Беларусі Мікалая Іванавіча шырока выкарыстоўваюцца ў школах Гомельшчыны.

Яго дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі на памежнай з Гомельшчынаю Браншчыне ў вёсцы Дзяменка Навазыбкаўскага раёна. Мікалай быў восьмым дзіцем у шматдзетнай сялянскай сям'і. Яго бацька, Іван Васільевіч, да вайны працаваў старшынёй калгаса і сельскага Савета, а маці, Ульяна Іванаўна, была калгасніцай. Яна не толькі дбайна працавала на сельскіх палетках, была клапатлівай хатняй гаспадыняй, а паспяхова выхоўвала і сваіх дзяцей. Ёй прысвоена ганаровае званне "Маці-гераіня".

Іван Васільевіч прайшоў цяжкія дарогі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, быў ранены, з'яўляўся інвалідам вайны. Мікалай Гутнікаў усё сваё жыццё прысвяціў педагагічнай працы — сеяў разумнае, добрае, вечнае... А пачыналася ўсё са школы. Навучаючыся ў ёй, ён цвёрда вырашыў стаць выкладчыкам фізічнай культуры і праводзіць урокі так, як і яго першы настаўнік — Уладзімір Іванавіч Шытаў. Яму хацелася так прыгожа, як і ён, выконваць гімнастычныя практыкаванні і навучаць гэтаму дзяцей.

Прайшоў пэўны час, і мары хлопца ажыццявіліся — мэтанакіраваны, здольны падлетак стаў добрым спартсменам. Пасля заканчэння школы ён паступіў у Гомельскі дзяржаўны тэхнікум фізічнай культуры, які закончыў з чырвоным дыпломам. У час вучобы не толькі паспяхова займаўся спартыўна-масавай і фізкультурна-аздараўленчай работай, але і актыўнай грамадскай дзейнасцю.

Адказнага, здольнага юнака адразу заўважылі і запрасілі ў райкам камсамола. Але Мікалай Іванавіч гарэў жаданнем працаваць у школе. так яно і сталася: у абласным аддзеле адукацыі лёс звёў яго з толькі што прызначаным на пасаду дырэктара Пакалюбіцкай школы А.Г.Зайцавым, які прапанаваў яму пайсці працаваць настаўнікам фізічнай культуры ў школу, якую ён узначальваў. Мікалай Іванавіч пагадзіўся. Вядома, спачатку было нялёгка. Аўтарытэт заваёўваўся самаадданай працай. Перш за ўсё на належную прыступку быў пастаўлены сам прадмет фізічнай культуры. Працаваў малады настаўнік на сумленне, як вучылі педагогі тэхнікума, трэнер В.С.Бандарэнка, які дапамог яму знайсці дарогу ў вялікі спорт. Аказвалі пэўнае садзеянне і калегі па працы.

Адначасова не парываў ён сувязяў і са спортам, выступаючы на спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы розных узроўняў. І поспех да яго прыйшоў — стаў майстрам спорту ў трайным скачку. Яго рэкорд — 15.10, а ў 1965 годзе Мікалай Гутнікаў выканаў нарматывы майстра спорту па лыжных гонках на дыстанцыі 30 км. Удзельнічаў у спаборніцтвах марафона па лыжных гонках і неаднойчы перамагаў, быў чэмпіёнам вобласці, рэспублікі, былога Саюза ў гэтым відзе спорту, быў рэкардсменам, уваходзіў у зборныя каманды вобласці і рэспублікі.

"Заўсёды я любіў такія дыстанцыі", — заўважае Мікалай Іванавіч.

Галоўнае ў жыцці настаўніка — любоў да фізічнай культуры, спорту і дзяцей. Дзень за днём, месяц за месяцам, год за годам Гутнікаў фізічна загартоўваў вучняў, асабістым прыкладам вёў іх у краіну здароўя. Сумесна са школьнікамі пабудаваў першую спартыўную залу, не шкадуючы ні сіл, ні часу, былі потым абсталяваны сучасная зала і спартыўная пляцоўка. Дзеля этага Мікалаю Іванавічу прыйшлося нямала пакалясіць па былым Саюзе, каб знайсці адпаведны праект. Але пастаўленай мэты дасягнуў — сённяшнія вучні займаюцца фізкультурай у цудоўных умовах.

Методыка Мікалая Гутнікава, выдатніка адукацыі Беларусі, пабудавана на прынцыпах гуманізму. І яна прыносіць станоўчыя вынікі. Сведчаннем з'яўляецца тое, што неаднаразова каманды Пакалюбіцкай школы займалі першыя месцы ў раёне, вобласці, рэспубліцы і на належным узроўні прадстаўлялі краіну нават у Саюзе па ўсіх відах спартыўных гульняў "Старты надзей". Так, у 1977 годзе ў піянерскім летніку "Артэк" вясковыя школьнікі з Гомельшчыны паспяхова выступілі на усесаюзных спаборніцтвах. Вопытам Мікалая Іванавіча зацікавіліся ў Маскве. Неўзабаве адтуль прыехалі азнаёміцца з ім на месцы і ўхвалілі яго. Сакрэт поспеху Гутнікава заключаўся ў тым, што ён праводзіў дзейсную індывідуальную работу па фізічным выхаванні і здаровым ладзе жыцця з дзецьмі і бацькамі. І гэта прыносіла плён.

Гутнікаў добра ведае, як і калі патрэбна адзначыць станоўчае, актывізаваць рухальную актыўнасць школьнікаў, прывіць ім цікавасць да фізічнай культуры. Ён выхоўвае высокія маральныя якасці, умее знайсці падыход да кожнага з выхаванцаў. Умелае валоданне методыкай выкладання прадмета, выдатныя арганізатарскія здольнасці, працалюбства, ініцыятыўнасць, адказнасць перад вучнямі, бацькамі, калегамі па працы — вось што характарызуе настаўніка. Гутнікаў сёння — адзін з самых паважаных людзей на вёсцы. Не дзіўна таму, што ў школе пануе культ "яе вялікасці" фізічнай культуры. Тут дзейнічаюць пэўныя правілы, устаноўленыя настаўнікам многа гадоў назад: нельга, напрыклад, заходзіць у спартыўную залу без адпаведнага абутку, спартыўнай формы. І ніхто ніколі не парушае гэты парадак — у зале выдатныя санітарна-гігіенічныя ўмовы, у раздзявалках заўжды чысціня. Бацькі перадаюць гэтую навуку дзецям, старэйшыя — малодшым...

Спартыўная зала ў школе ніколі не пустуе. У ёй заўжды звіняць дзіцячыя галасы, бо фізічная культура і спорт тут у вялікай пашане. За многія гады тут выпрацаваны адпаведныя традыцыі ў правядзенні спартыўна-масавай і аздараўленчай работы. Захапляюча праходзяць унутрышкольныя і ўнутрыкласныя спаборніцтвы. Любяць вучні сустрэчы з аднагодкамі з іншых школ, выпускнікамі-спартсменамі. Па выхадных у зале займаюцца бацькі з дзецьмі.

Цікава праходзяць спаборніцтвы паміж зборнымі камандамі школы, студэнтамі, ветэранамі фізічнай культуры. Усе мерапрыемствы праводзяцца ўрачыста.

Ажыццяўляецца і такая форма работы, як провады на "спартыўную" пенсію. Для будучага пенсіянера-фізкультурніка пішуцца і чытаюцца вершы, у яго гонар узнімаецца і апускаецца сцяг, яму прысвячаюцца цікавыя гульні, дзеці ўручаюць памятныя падарункі.

Урок фізічнай культуры, які праводзіць Мікалай Іванавіч, — гэта заўсёды свята. Валоданне голасам, целам, каментар пасля кожнага практыкавання, музычнае суправаджэнне, паважлівыя адносіны да вучняў ствараюць здаровы эмацыянальны фон.

Да кожнага ўрока педагог грунтоўна рыхтуецца. "Рыхтуючы сябе — рыхтую вучняў", — гаворыць Мікалай Гутнікаў. Кожны школьнік для яго — асоба. Невыпадкова 16 выхаванцаў настаўніка паспяхова скончылі факультэт фізічнага выхавання і спорту. Сярод іх — Г.П.Васякоў і А.В.Васількова, якія працуюць настаўнікамі фізічнай культуры ў школах Гомельшчыны. Узровень пазнавальнай цікаўнасці да прадмета "Фізічная культура" ў школе вельмі высокі — 97 працэнтаў вучняў ад усёй колькасці іх. Значная частка школьнікаў займаецца ў спартыўных секцыях. І што характэрна — ніхто з іх не курыць. Нават стаўшы дарослымі, былыя вучні саромеюцца закурыць цыгарэту пры настаўніку — сам Мікалай Іванавіч вядзе здаровы лад жыцця.

Не песціла Мікалая Гутнікава асабістае жыццё. Аднак не страціў ён сваіх лепшых якасцей, аптымізму, за ўсё ўдзячны лёсу, людзям, заўсёды стройны, падцягнуты, поўны новых ідэй і задумак, ана кожны свой чарговы ўрок прыходзіць з іскрынкаю ў вачах.

Моцна стаіць "храм фізічнай культуры" ў вёсцы пад Гомелем з прыгожаю назваю Пакалюбічы, і гарыць у ім "агонь здароўя". Прыемна, што ёсць такія педагогі, як Мікалай Іванавіч, якія самааддана любяць людзей, дзяцей, любімую справу. Ён перадае свой багаты вопыт калегам па працы, дзеліцца педагагічным майстэрствам з маладымі настаўнікамі, запальваючы агеньчык любові да выбранай прафесіі, да сваёй працы.

У сувязі з юбілеем настаўніка хочацца ад сябе асабіста і рэдакцыі "Настаўніцкай газеты" павіншаваць М.І.Гутнікава і пажадаць яму далейшых поспехаў у працы па фарміраванні здаровага ладу жыцця падрастаючага пакалення сродкамі фізічнай культуры, моцнага здароўя і шчасця ў асабістым жыцці.

Валянціна БРУНДУКОВА,
намеснік дырэктара
Гомельскага абласнога цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў.

З задавальненнем займаюцца спортам вучні школы-інтэрната Дзятлава пад кіраўніцтвам Мікалая Мікалаевіча Кавалёва. У мінулым годзе каманда, якую ён узначальваў, заняла другое месца на рэспубліканскіх спаборніцтвах "Калядныя сустрэчы" і першае — на абласных спаборніцтвах па міні-футболе. У гэтым годзе вучні са сваім трэнерам таксама збіраюцца на рэспубліканскія спаборніцтвы па міні-футболе, таму што ў сябе ў вобласці яны занялі першае месца.

НА ЗДЫМКУ: заўсёды цікава на ўроку фізкультуры, які праводзіць Мікалай Мікалаевіч Кавалёў.

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БЕЛТА.

У Ігара Каляды — тытул чэмпіёна Украіны

Лепшыя спартыўныя сілы краіны сабраў адкрыты чэмпіянат Украіны па плаванні, які адбыўся ў харкаўскім водным цэнтры "Акварэна". Спрэчку за месца ў нацыянальных саставах вялі паміж сабой мясцовыя атлеты, якія будуць удзельнічаць у розных буйных стартах года, у тым ліку і ў чэмпіянаце свету ў Японіі. Акрамя мясцовых плыўцоў і беларусаў спаборнічалі атлеты з Узбекістана і Магілёва. Прыемна, што ў ім прыняў удзел і студэнт юрыдычнага факультэта Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута, майстар спорту па плаванні, уладальнік "Гран-пры" 1997 года, чэмпіён Рэспублікі Беларусь 1997 і 1998 гадоў, член нацыянальнай зборнай каманды краіны Ігар Каляда. У плаванні на 200 метраў краліст з Гродна заваяваў тытул чэмпіёна Украіны з вынікам 1.52.23. У папярэднім заплыве стометроўку ён пераадолеў за 52,30.

Аксана Воўна заняла дастаткова высокае месца — пятае — на кролевай дыстанцыі 400 метраў (4.27.51). А праплыўшы 200 м за 2.13.95, спартсменка з Салігорска ў фінал не трапіла. Ігар жа Лісянскі з Наваполацка, паспяшаўшыся на старце, быў дыскваліфікаваны.

Пісьмо ў рэдакцыю

Як ацэньваць паспяховасць школьнікаў?

Намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце зрабіў заўвагу ў класным журнале аб парушэнні нарматыўных дакументаў ацэнкі ведаў вучняў па фізічнай культуры.

Прашу патлумачыць, ці выстаўляецца школьніку чацвёртага класа адзнака "два" па нарматывах бягучага ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці ў выпадку невыканання іх на "3" пасля серыі навучальных урокаў (60 метраў з высокага старту, скачкі ў даўжыню з разбегу, кіданне мяча на далёкасць і г.д. — гл. стар.35 "Праграмы па фізічнай культуры для вучняў пачатковых класаў агульнаадукацыйных школ". Мінск, 1999 г.).

Варта зазначыць, што гэты вучань жыве ў Віцебскай вобласці, не адстае ў фізічным развіцці, не хварэў у час навучання па авалоданні пэўнымі ведамі, уменнямі і навыкамі і не адносіцца па стане здароўя да падрыхтоўчай медыцынскай групы.

Сяргей ДУБАЎСКОЙ,
настаўнік першай катэгорыі гімназіі Наваполацка Віцебскай вобласці.

Рэдакцыя "Настаўніцкай газеты" папрасіла пракаментаваць пісьмо Сяргея Дубаўскога метадыста вышэйшай катэгорыі Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь **Аляксандра Канішчава**. Вось што ён сказаў:

— У адпаведнасці з загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 1994 г. № 433 "Часовыя нормы ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў вучняў агульнаадукацыйных школ" ацэнка паспяховасці школьнікаў па прадмеце "Фізічная культура" вызначаецца на аснове засвоення пройдзенага матэрыялу. Крытэрыямі ацэнкі з'яўляюцца адзіныя патрабаванні, якія ў комплексе аб'ектыўна адлюстроўваюць індывідуальны ўзровень ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама развіцця рухальных якасцяў вучняў на пэўным этапе навучання.

Аб'ектаўная і сістэматычная ацэнка працы вучняў заклікана станоўча ўплываць на развіццё разумовых і рухальных здольнасцей вучняў. Важнейшым рычагом у фарміраванні асобы школьніка з'яўляецца адпаведнасць ацэнкі яго сапраўднай працы. У працэсе авалодання новымі рухамі кожны вучань праходзіць пэўныя этапы навучання, у час якіх фарміруюцца яго веды, выхоўваюцца маральна-валявыя рысы асобы і развіваюцца рухальныя якасці.

Настаўнік можа ацэньваць школьнікаў бягучымі адзнакамі на ўроках фізкультуры па некалькіх асноўных накірунках: агульных тэарэтычных звестках аб сацыяльнай сутнасці, медыка-біялагічных асновах і гісторыі фізкультуры і спорту, па асноўных відах рухаў, правілах рухомых, народных і спартыўных гульняў, спаборніцтвах, забеспячэнні бяспекі фізкультурных заняткаў.

Уменні і навыкі вызначаюцца на аснове кантролю не толькі вынікаў, але і працэсу засвоення вучнямі тэхнікі фізічных практыкаванняў. Адзнакі могуць выстаўляцца як за закончаны рух, так і за асобныя яго элементы.

З улікам праграмных матэрыялаў, а таксама розных кантрольных і тэставых практыкаванняў устанаўліваецца ўзровень развіцця рухальных якасцей навучэнцаў.

Дамашнія заданні прадугледжваюць самастойнае развучванне школьнікамі практыкаванняў або цэлых комплексаў, а таксама выкананне асобных з іх, якія носяць трэніровачны характар.

Пэўным чынам улічваецца і руплівасць дзяцей.

Нельга забываць і аб фарміраванні маральных і маральна-валявых якасцей (свядомая дысцыпліна, пачуццё адказнасці, самаацэнка выконваемай работы, добрасумленныя адносіны да даручэнняў настаўніка, мэтанакіраванасць, рашучасць, смеласць і г.д.). Вельмі важна, каб усе гэтыя якасці вучняў настаўнік трымаў у полі зроку і даваў ім адпаведную ацэнку з улікам індывідуальных асаблівасцей кожнага школьніка. Выніковыя чацвяртная і гадавая адзнакі выстаўляюцца на аснове бягучых адзнак па разнастайнай дзейнасці вучняў. Пры гэтым ні адзін з накірункаў яе не павінен пераважаць над іншымі.

Крайне недапушчальна ацэньваць веды школьнікаў толькі на аснове бягучых адзнак, за нарматывы фізічнай падрыхтаванасці. Нельга зніжаць як бягучыя, так і выніковыя адзнакі за стан спартыўнай формы, няўдзел у школьных фізкультурна-спартыўных і спартыўна-масавых мерапрыемствах, а таксама ставіць двойкі за пропускі ўрокаў фізкультуры без уважлівых прычын.

Не з'яўляюцца асновай для зніжэння выніковай адзнакі невыкананне пэўных колькасных паказчыкаў па не залежных ад вучня прычынах (напрыклад, пропуск урокаў па хваробе, непрапарцыянальнае фізічнае развіццё, залішняя вага і г.д.) пры станоўчых бягучых адзнаках за атрыманыя ўменні і навыкі, засвоеныя веды, старанасць.

На пытанне аб выстаўленні вучням чацвёртага класа адзнакі "2" па нарматывах бягучай ацэнкі ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці ў выпадку невыканання кантрольнага практыкавання на адзнаку "3" пасля серыі навучальных урокаў (пры ўмове, што школьнік не пражывае ў зоне радыяцыйнага забруджання і па стане здароўя аднесены да асноўнай групы па фізкультуры) адказ станоўчы: вучням этага класа выстаўляць адзнаку "2" можна.

Аб сістэме выстаўлення адзнак у пачатковай школе можна даведацца з тлумачальнай запіскі дзеючай праграмы па фізічнай культуры для вучняў пачатковых класаў агульнаадукацыйнай школы (перапрацаванай і дапоўненай) у 1999 годзе.

Салігорскі каскад рэкордаў

Удзельнікаў адкрытага чэмпіянату краіны на так званай кароткай вадзе ўпершыню ў гісторыі беларускага плавання сустракаў горад шахцёраў — Салігорск. Месцам правядзення першага чэмпіянату плыўцоў у новым стагоддзі 25-метровы мясцовы басейн "Крышталь" быў абраны не выпадкова. Горад мае не толькі багатыя працоўныя дасягненні, але і спартыўныя традыцыі. На чэмпіянат сабраліся ўсе мацнейшыя плыўцы, за выключэннем студэнткі юрыдычнага факультэта Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута Наталлі Бараноўскай, якая рыхтуецца па індывідуальным плане. У адным з заплываў стартаваў нават студэнт гэтай ВНУ Алег Рухлевіч, які закончыў выступленні ў вялікім спорце, але прыйшоў да думкі, што рэзкі адыход ад актыўных заняткаў шкодны.

Адлік вышэйшым нацыянальным дасягненням пачалі ўжо ў першы дзень спаборніцтваў Ганна Шчэрба з Баранавічаў і мясцовая плыўчыха Ганна Капачэня на дыстанцыі 200 метраў. Пры гэтым Шчэрба паказала цудоўныя вынікі ў комплексным плаванні — 2.15,54, а Капачэня — батэрфляем — 2.15,72. Апошняя, дарэчы, тройчы была ўдастоена чэмпіёнскага тытула на 100 і 200 метраў батэрфляем і ў эстафеце 4Х50 метраў разам са Святланай Хахловай, Аксанай Воўна і Таццянай Платкоўскай. Чэмпіёнамі двойчы сталі Таццяна Платкоўская (апроч эстафеты і 200 метраў на спіне) і Аляксандр Зык (200 і 400 метраў комплексным плаваннем).

На рахунку плыўцоў Міншчыны — тры з чатырох новых рэкордаў Беларусі. У тым ліку на 200 метраў батэрфляем — Ганна Капачэня (2.15,72), на чатырыста метраў комплексным плаваннем — Аляксандр Зык (4.22.30), у жаночай камбінаванай эстафеце 4х50 метраў (1.56.06 сек.). Асаблівую ўвагу хацелася б звярнуць на А.Карчміну з Салігорска — на дыстанцыі 200 метраў батэрфляем на спіне яна двойчы перавысіла майстарскі нарматыў.

Варта зазначыць, што больш чым два дзесяцігоддзі плёна працуе па падрыхтоўцы плыўцоў высокага класа для зборных каманд краіны мясцовая дзіцяча-юнацкая спартыўная школа. На працягу чатырох дзён яе выхаванцы спаборнічалі разам з іншымі мацнейшымі майстрамі водных дарожак у дзевятнаццаці відах праграмы — у скарбонку каманднага заліку ішлі толькі майстарскія вынікі. Выхаванцы школы пацвердзілі гэта і ў ходзе чэмпіянату ў сваім родным горадзе. Гэта акалічнасць, а таксама ўдзел у чэмпіянаце вядучых плыўцоў садзейнічалі высокай канкурэнцыі на дыстанцыях у "Крышталі".

У агульнакамандным заліку перамаглі плыўцы Мінскай вобласці — 33341 ачкоў На другім месцы зборная Мінска — 25253 і на трэцім — гамяльчане — 18599.

Акцэнтуючы ўвагу на выступленнях асобных удзельнікаў чэмпіянату, неабходна асабліва адзначыць поспех Ганны Шчэрба, выхаванкі спартыўнай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву з Баранавічаў і Людмілы Пархімчук. Адна з лідэраў нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь, Ганна Шчэрба, тройчы ўзнаўляла рэкорды краіны ў комплексным плаванні на кубкавых этапах. Не выпадкова на ўсіх трох дыстанцыях (100, 200 і 400 метраў) батэрфляем у Салігорску ў гэтым відзе праграмы яна была мацнейшай. Прыемна тое, што следам за ёй фінішавала яе малодшая сястра Марыя, якая ў заплыве на сто метраў была ў Шчэрбы ў саперніках.

У цудоўнай спартыўнай форме выступіў Павел Лагун — студэнт юрыдычнага факультэта Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута, майстар спорту па плаванні, член нацыянальнай зборнай каманды Рэспублікі Беларусь, удзельнік XXVII Алімпійскіх гульняў у Аўстраліі. Тройчы ён, як і Шчэрба, не так даўно ўзнаўляў рэкорды на этапах Кубка свету. У Салігорску першы этап камбінаванай эстафеты 4х50 метраў з нацыянальным дасягненнем 25,46 ён імкліва пераадолеў на спіне. Яго пераможны пачын своечасова дружна падтрымалі ўдзельнікі каманды зборнай сталіцы — студэнт факультэта гісторыі і псіхалогіі Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута, майстар спорту міжнароднага класа па плаванні, неаднаразовы чэмпіён і рэкардсмен Рэспублікі Беларусь, чэмпіён Расіі 1996 і 1997 гадоў, удзельнік Алімпійскіх гульняў 1996 і 2000 гг. у Атланце і Сіднеі, бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы 1996 года член нацыянальнай зборнай каманды краіны Дзмітрый Каліноўскі. Дзяніс Перагуд і Алег Шкуратаў. Іх вынік — 1.43.56. У індывідуальных нумарах праграмы (50 і 100 метраў батэрфляем, 50 — на спіне) Павел Лагун тройчы выходзіў пераможцам. На вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ён узняўся сумесна з Дзмітрыем Каліноўскім, Сяргеем Войцэхам, Максімам Крукам. Але пераўзышла ўсе надзеі і спадзяванні выхаванка сталічнай дзіцяча-юнацкай школы "Старт" майстар спорту Аляксандра Герасіменя, якая на дыстанцыі 50 метраў на спіне ўстанавіла новы рэкорд краіны. Папярэдняе дасягненне пры гэтым Аляксандра паляпшала двойчы: спачатку ў паўфінальным заплыве — 28,45, а затым у фінале — 28,27. Няцяжка ўявіць, што **пятнаццацігадовая мінчанка была зусім недалёка ад сусветнага рэкорду**, які роўны 27,27. З міжнародным вынікам — 1.01.53 — Герасіменя стала мацнейшай і на дыстанцыі ўдвая даўжэйшай.

Чэмпіёнскія тытулы заваявалі таксама Алена Дварэцкая і Настасся Лях на 50, 100 і 200 метраў брасам, Сяргей Шаўко і Дзяніс Сілкоў на 100 і 200 метраў на спіне, у комплексным плаванні і батэрфляем.

Старт — на Пекін

Рэспубліканскі цэнтр фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у сталічным Палацы лёгкай атлетыкі правёў спаборніцтвы па дзюдо ў праграме рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў. Старт гэты — адзін з этапаў адбору на Сусветную універсіяду ў Пекіне.

Сярод мужчын у выніку напружанай барацьбы перамогу атрымалі студэнты Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута, другое месца — у каманды Белдзяржуніверсітэта, а трэцяе — Акадэміі Міністэрства унутраных спраў.

Дзюдо ва ўсіх гэтых навучальных установах надаецца асаблівае значэнне. Гэты від спорту тут адзін з самых любімых і паважаных.

Сярод жанчын першынствавуў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт. На другім месцы — Міжнародны гуманітарна-эканамічны універсітэт, на трэцім — студэнты Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта.

З самага лепшага боку сярод студэнтак прадэманстравала свае спартыўныя магчымасці Юлія Барысік з Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта, якая заваявала абсалютнае першынство ў спаборніцтвах сярод дзяўчат у вазе звыш 78 кілаграмаў. У сувязі з адсутнасцю алімпійскага прызёра Анатоля Ларукова першае месца ўпэўнена заняў 18-гадовы Дзяніс Калтанюк з Беларускага камерцыйнага універсітэта кіравання.

Паспяхова выступілі Сяргей Жданюк і Сяргей Шундзікаў з Белдзяржуніверсітэта.

Абсалютнае першынство ў вазе звыш ста кілаграмаў прадэманстраваў Леанід Свірыд з Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута.

Цудоўныя спартыўныя якасці ў чарговы раз праявіў знакаміты спартсмен, студэнт факультэта гісторыі і псіхалогіі з гэтага ж інстытута Націк Багіраў.

У новым алімпійскім цыкле гэтыя спаборніцтвы — першы сур'ёзны крок. Прыемна, што ў нас многа таленавітай моладзі, якая, будзем спадзявацца, адпаведна праявіць сябе ў спаборніцтвах самага высокага рангу.

Лепшы вынік на планеце

У закрытых памяшканнях у Лісабоне Наталля Сафроннікава — студэнтка факультэта гісторыі і псіхалогіі Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута, майстар спорту міжнароднага класа па лёгкай атлетыцы, удзельніца Алімпійскіх гульняў 1996 года ў Атланце, бронзавы прызёр Кубка Еўропы, чэмпіёнка Беларусі 1997 г., рэкардсменка рэспублікі 1998 года на мінулым чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы — заняла трэцяе прызавое месца ў бегу на 200 метраў. Упершыню беларуская каманда выйграла медаль на спрынтэрскай дыстанцыі.

У паўфінале Наталля ўстанавіла новы рэкорд Беларусі — 23,02 секунды, а ў бегу на 60 метраў на нядаўнім першынстве краіны ўстанавіла нацыянальны рэкорд — 7,04 секунды. У цяперашнім сезоне гэты вынік з'яўляецца лепшым на планеце.

Паяўленне на Беларусі добрых спартсменаў у бегавых дысцыплінах — цалкам магчыма, лічыць прэзідэнт Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Аляксандр Рудскіх. Ставіць высокія мэты і імкнуцца да іх дасягнення трэба ўсім: трэнерам, спартсменам, адказным спецыялістам

Алімпійскія надзеі

Трэці міжнародны турнір па жаночай барацьбе (вольнай) адбыўся ў Хмяльніцкім на Украіне. На ім паспяхова выступілі восем выхаванак Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, якія прадстаўлялі каманду нашай краіны.

У катэгорыі 70 кг першае месца заняла Святлана Галіцына, другое — Ірына Кругленя (49 кг — абедзве з ДЮСШ Любані), трэцяе — Паліна Кашэева (52 кг, СДЮШАР РЦФВІС), Таццяна Калеснікава (Любань) і Марына Маркевіч (38 кг, СДЮШАР, Салігорск). Гэтыя выступленні з'явіліся адным з этапаў падрыхтоўкі да кадэцкага чэмпіянату Еўропы ў Стамбуле. Але гэтыя дзяўчаты яшчэ паспрачаюцца за ўзнагароды на першынстве нашай дзяржавы і ў міжнародных спаборніцтвах у Мінску. Акрамя адзначаных, да спартсменак, якія падаюць надзеі, адносяцца Алена Рабовіч (ДЮСШ, Смалявічы), Ірына Лазарэвіч і Юлія Івінская (абедзве — СДЮШАР, РЦФВІС), спецклас СДЮШАР № 7 Мінска па жаночай барацьбе (трэнер А.Ярмак).

На вяршыні п'едэстала — самая юная

У дзвюх узроставых групах — з 14 да 16 год — у шахматным клубе і Доме культуры ў Пінску адбылося юнацкае першынство Беларусі па шахматах, у якім удзельнічалі 130 спартсменаў.

Самая юная ўдзельніца — мінчанка Алена Таірава са спартыўнай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву, якая не мае яшчэ і 10 год, перамагла сярод малодшых дзяўчынак і ўзнялася на п'едэстал гонару.

Варта зазначыць, што два гады назад Алена заняла пятае месца сярод дзяўчынак да дзесяці год, а чацвёртай была ў мінулым годзе. Не выпадкова ёй вызначана персанальная стыпендыя, устаноўленая генеральным шахматным спонсарам — "Белтрансэкспедыцыяй" — за лепшы вынік, паказаны маладымі беларускімі спартсменамі ў чэмпіянатах свету і Еўропы апошніх год. Трэцім у жыцці падобным выпрабаваннем стане для дзяўчынкі збор самых таленавітых дзесяцігадовых шахматыстаў планеты сёлета. Пры гэтым пераможца Беларусі атрымае права выбару: стаць удзельнікам чэмпіянату свету ці Еўропы. Грэцыя летам будзе прымаць чэмпіянат кантынента-2001, а месца правядзення чэмпіянату свету, які адбудзецца пазней, яшчэ не вызначана.

У гэтай узроставай групе Аляксандра Савурка з Гомельскай і Ірына Лісоўская з Брэсцкай абласцей атрымалі аднолькавую колькасць ачкоў — па 7 з 9 магчымых.

А сярод хлопчыкаў лідзіраваў Сяргей Жыгалка са сталіцы. На яго рахунку — 7,5 ачка з 9. На другім месцы — Вася Якушаў са спартыўнай дзіцячаюнацкай школы алімпійскага рэзерву № 11 Мінска і Андрэй Сяўко з Гродзенскай вобласці, якія атрымалі адпаведна па 7 і 6,5 ачка.

У старэйшай узроставай групе сярод хлопчыкаў у выніку вострай, напружанай барацьбы Андрэй Жыгалка з Мінска набраў аднолькавую колькасць ачкоў з віцебчанінам Мікітам Маёравым. На паўачка менш у трэцяга прызёра — Алега Ермашука з Гродзенскай вобласці.

Сярод 15-гадовых дзяўчынак лідзіравала брэстаўчанка Ганна Шарэвіч, якая атрымала лепшы вынік ва ўсім першынстве — 8,5 з 9. Другое месца заняла Вольга Герасімовіч з Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі сталіцы і трэцяе — Таццяна Грыб з Магілёўскай вобласці. Прыемна, што нароўні з юнымі прадстаўнікамі горада-героя Мінска, а іншы раз і з больш высокімі вынікамі змагаліся іх равеснікі з іншых рэгіёнаў. Удзельнікі, якія вызначыліся на першынстве Беларусі, будуць прадстаўляць нашу краіну на чэмпіянаце свету — у Іспаніі і Еўропы — у Грэцыі.

Перамаглі мінчане

Чэмпіянат Беларусі па мнагабор'і "Здароўе" і другі этап Кубка свету па папулярным відзе спорту — паліатлоне адбыліся ў Віцебску.

Паліатлон з'явіўся як прадаўжальнік добра вядомага комплексу ГПА (гатоў да працы і абароны) і называецца па-рознаму ў суседніх дзяржавах.

У спаборніцтвах удзельнічалі атлеты з Масквы і Санкт-Пецярбурга, Ленінградскай вобласці.

У беларускім чэмпіянаце ўпершыню за многія гады перамаглі мінчане, на рахунку якіх 2336 ачкоў. На другім месцы — магіляўчане — 2278 і на трэцім — каманда Мінскай вобласці — 2189.

Расіяне першынствавалі ў Кубку свету, гаспадары фінішавалі другімі. А месцы сярод тэрытарыяльных зборных размеркаваліся наступным чынам: на першым месцы — Масква, Санкт-Пецярбург — на другім і Светлагорск — на трэцім.

9 чалавек выканалі нарматывы майстра спорту. Варта зазначыць, што адзін з іх, Аляксандр Багдановіч, настаўнік з Мінска, які падцягнуўся 90 разоў за 4 хвіліны (заліковы час).

Выйгралі навучэнцы

Перад атлетамі 1984-1985 гадоў нараджэння — удзельнікамі асабістага каманднага першынства Гомеля па грэка-рымскай барацьбе — гасцінна адчынілі свае дзверы Дом фізкультуры і спорту горада над Сожам. Пераможцамі ў камандным заліку аказаліся выхаванцы абласной дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву па грэка-рымскай барацьбе.

У асабістых спаборніцтвах у сваіх вагавых катэгорыях выйгралі Аляксей Байкоў (58 кг.), Аляксей Таргоўнікаў (63 кг.), Аляксей Галавацяпаў (85 кг.) — усе яны з ДЮСШАР Гомеля.

Старонку да друку падрыхтавалі Пётр ШУБЯНОК і Алёна ЕВІНКА

У рэчышчы народных традыцый

Мядоцкая вясёлка

Вёска Мётча, што на Барысаўшчыне, з'яўляецца тэрытарыяльным і культурным цэнтрам Мядоцкага краю. Так пяшчотна называюць тутэйшыя людзі свой родны кут, дзе суседнічаюць каля дваццаці вёсак і вёсачак, што раскінуліся па абодва берагі ракі Мужаны — дачкі славутай Бярэзіны. Галоўным асяродкам культуры Мётчы і яе ваколіц з'яўляецца Мядоцкая сярэдняя школа, багатая гісторыя якой вядзе свой пачатак з 1884 года. Сёння школа займаецца стварэннем сістэмы выхавання дзяцей сродкамі народнай культуры. Цэнтр традыцыйнага народнага мастацтва, які дзейнічае на базе ўстановы, аб'ядноўвае каля 15 гурткоў і суполак. Самая шматлікая суполка цэнтра — фальклорны гурт "Берагіня". 19-20 мая ён адсвяткуе свой 5-гадовы юбілей.

З 1996 года кіруюць "Берагіняй" яе заснавальнікі — этнахарэограф і фалькларыст Мікола Козенка і завуч школы, філолаг і народны музыка Антаніна Абрамовіч. У гурце займаецца каля 50 хлопцаў і дзяўчат — шчырых прыхільнікаў і даследчыкаў культуры роднай вёскі і яе ваколіц. Але творчая дзейнасць суполкі арганізавана так, што народны побытавы танец, карагод, гульня, песня з'яўляюцца для дзяцей не толькі аб'ектамі вывучэння, але і сродкамі жыццядзейнасці.

Рэпетыцыі і выступленні "Берагіні" нагадваюць цікавую гульню, на працягу якой дзеці становяцца то спевакамі, то танцорамі, то музыкамі. Кожны артыст можа быць салістам. Расказваючы і ўдасканальваючы свае мастацкія здольнасці, выканаўцы натуральна і нязмушана засвойваюць этыкет партнёрскіх узаемін, вучацца быць стараннымі, цярплівымі і добрымі. Дэвіз кожнага ўдзельніка — быць непадобным да іншых і прыгожым, як усе. Адметнасцю гурта з'яўляецца таксама і тое, што артысты апранаюцца ў святочныя строі, пашытыя з улікам мясцовых традыцый і аздобленыя рукамі дзяцей, бацькоў і настаўнікаў.

Багацце і разнастайнасць беларускага, асабліва мясцовага танцавальнага, гульневага і музычнага фальклору добра адлюстроўваецца рэпертуарам ансамбля: полькі "Разява", "Кацярынка", "Полька да ўпаду", старадаўнія і больш позняга паходжання танцы "Кракавяк", "Лявоніха"... Удзельнікі калектыву з задавальненнем водзяць карагоды, вельмі любяць спяваць абрадавыя і пазаабрадавыя песні і прыпеўкі... Пры выкананні народных танцаў здольнасцю да імправізацыі і ўменнем мастацкага пераўвасаблення вызначаюцца Ірына Касцюковіч і Дзіма Ткачоў, Паліна Абрамовіч і Віктар Радзюк, Ірына Рыбакова і Юрась Касцюковіч, Наталля Касцюковіч і Іван Радзюк, Ганна Паўлавец...

Улюблёны ў фальклор, калектыў ансамбля аддае яму і свой час, і сілы, і душу, сваё паэтычнае натхненне. Гэта бачна, гэта даўно заўважана. Нездарма гурт стаў лаўрэатам V Міжнароднага фестывалю народнага танца "Палескі карагод" (2000 г., г.Пінск), IV Рэспубліканскага фестывалю "Беларуская полька" (г.Чачэрск). Амаль палова ўдзельнікаў "Берагіні" сталі лаўрэатамі I Рэспубліканскага конкурсу танцавальных пар — выканаўцаў народных побытавых танцаў (Чачэрск, 2000 г.). Надоўга запомніўся дзецям і ўдзел у "Сожскім карагодзе" (Гомель, 1999 г.), выступленні на Першым рэгіянальным фестывалі фальклорнага мастацтва ў г.п.Акцябрскі Гомельскай вобласці... Іншымі словамі, за час існавання гурта акрамя ўдзелу ў агульных мерапрыемствах калектыў даў звыш 50 сольных канцэртаў, кожны з якіх абавязкова прайшоў "на ўра". Не стане выключэннем і сёлетні, юбілейны канцэрт "Берагіні", падрыхтоўка да якога вядзецца сур'ёзна і з ўсёй адказнасцю. З нагоды ўрачыстасці запланаваны фальклорныя чытанні, сямейная вечарына з песнямі, гульнямі, забавамі і скокамі, конкурс танцавальных пар — выканаўцаў народных побытавых танцаў сярод вучняў школ рэгіёна міжрэчча Бярэзіны, Бабра і Схі, канцэртныя выступленні гасцей свята.

НА ЗДЫМКУ: гурт "Берагіня" падчас канцэртнага выступлення.

Падрыхтавала Вольга ДУБОВІК.

Тыдзень турызму і краязнаўства

Як арганізаваць і правесці паход

Тыдзень турызму і краязнаўства для дзяцей і моладзі, які апошнім часам рэгулярна праводзіцца ў нашай краіне, з кожным годам набывае ўсё большую папулярнасць сярод вучняў агульнаадукацыйных школ, навучэнцаў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, студэнтаў тэхнікумаў і вышэйшых навучальных устаноў. Ён традыцыйна праводзіцца вясной, у канцы навучальнага года. Сёлета прынята рашэнне правесці яго з 21 па 27 мая. *Асноўная мэта тыдня — удасканаленне форм і метадаў патрыятычнага выхавання моладзі, актывізацыя турысцка-краязнаўчай работы ў адукацыйных і пазашкольных установах, шырокае далучэнне да заняткаў турызмам і краязнаўствам вучняў і студэнтаў.*

Адкрыццё тыдня адбудзецца 20 мая ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М.Горкага ў сталіцы. Аналагічныя мерапрыемствы пройдуць у іншых гарадах і рэгіёнах краіны.

У адпаведнасці з рэкамендацыямі па арганізацыі і правядзенні тыдня ва ўсіх раёнах, гарадах і абласцях ствараюцца адпаведныя аргкамітэты.

Яны распрацоўваюць рэгіянальныя праграмы правядзення тыдня, у якіх акцэнтуецца ўвага на такіх пытаннях, як удзел кожнага класа і навучальнай групы ў турысцкіх паходах па родным краі, правядзенне турысцкіх злётаў і спаборніцтваў, конкурсаў, канферэнцый, краязнаўчых алімпіяд і выстаў, віктарын, экскурсій, выкананне заданняў Усебеларускай турысцка-краязнаўчай экспедыцыі вучнёўскай моладзі "Наш край", папаўненне і абнаўленне экспазіцый музеяў, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, знакамітымі людзьмі, правядзенне паходаў, прысвечаных 56-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў з наведваннем мемарыяльных комплексаў "Брэсцкая крэпасць", "Хатынь", "Прарыў", музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Як жа лепш арганізаваць, напрыклад, турысцкі паход і правесці яго з найбольшай карысцю для вучняў?

Рыхтавацца да паходу павінны ўсе яго ўдзельнікі, і перш-наперш самі кіраўнікі. Педагогам сумесна з вучнямі неабходна вызначыць мэту і распрацаваць маршрут паходу. Мэтай можа быць: знаёмства з гістарычнымі і культурнымі помнікамі, эканомікай, этнаграфіяй і архітэктурай гарадоў і раёнаў, прыродай і запаветнымі мясцінамі. Паходы могуць праводзіцца дзеля сустрэчы з мясцовымі краязнаўцамі і вядомымі людзьмі, збору матэрыялаў для школьнага музея, у тым ліку для экспазіцыі "Нашы знакамітыя землякі" і г.д. Гэта можа быць звязана і з выкананнем пэўных заданняў — даследаваннем стану культурна-гістарычных помнікаў, малых рэк і вадаёмаў, зборам лекавых траў, калекцый мінералаў, раслін для гербарыяў і інш. Паход таксама можа быць трэніровачным, каб праверыць, як яго ўдзельнікі ўмеюць хадзіць пешшу на пэўную адлегласць, знаходзіць дарогу, арыентавацца на мясцовасці. Вялікую дапамогу пры вызначэнні мэты паходу могуць аказаць матэрыялы, апублікаваныя ў "Палажэнні аб Усебеларускай турысцка-краязнаўчай экспедыцыі вучнёўскай моладзі "Наш край"".

Пасля таго як мэта паходу вызначана, неабходна намеціць і распрацаваць канкрэтны маршрут, па якім будуць праведзены турысцкі паход ці падарожжа. Маршрут павінен быць цікавым для ўдзельнікаў і забяспечваць ім адпачынак. Значную дапамогу пры выбары маршруту, арганізацыі і правядзенні турысцкіх паходаў і падарожжаў можна атрымаць у цэнтрах, на станцыях і базах юных турыстаў.

Калі маршрут вызначаны, важна пазнаёміцца з усёй даступнай літаратурай аб славутых мясцінах, якія знаходзяцца на шляху руху турысцкай групы. Неабходна вывучыць складаныя ўчасткі маршруту і прадугледзець спосабы іх пераадолення. Пры выбары шляху не варта захапляцца яго працягласцю. Нярэдка бывае, што чым менш пройдзеш, тым больш даведаешся, убачыш і лепей адпачнеш.

Перад тым як адправіцца ў паход, неабходна скласці графік падарожжа, план краязнаўчай, грамадска карыснай працы і іншых мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца групай на маршруце.

У адпаведнасці з "Інструкцыяй па арганізацыі і правядзенні паходаў і экскурсій з вучнямі", зацверджанай загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 24 лістапада 1999 года № 698, кіраўніком і намеснікам кіраўніка турысцкага паходу можа быць педагагічны работнік, які мае вопыт арганізацыі шматдзённых паходаў. Вызначаны правы і абавязкі ўдзельнікаў і кіраўнікоў паходу. У прыватнасці, падкрэсліваецца, што кіраўнік і яго намеснік нясуць персанальную адказнасць за жыццё, здароўе дзяцей і бяспечнае правядзенне паходу, за выкананне аздараўленчай, выхаваўчай і пазнавальнай работы, правілаў пажарнай бяспекі, абыходжання з выбухованебяспечнымі прадметамі, аховы прыроды, помнікаў гісторыі і культуры.

Турысцкая група фарміруецца на добраахвотных пачатках са згоды бацькоў, вучняў, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі, сумеснай вучобай, заняткамі ў гуртках і секцыях, па месцы жыхарства, якія маюць неабходную падрыхтоўку для ажыццяўлення запланаванага паходу. Удзельнікі могуць быць прыкладна аднаго ўзросту. Ва ўсякім выпадку розніца ва ўзросце не павінна перавышаць двух-трох гадоў. Мінімальны ўзрост удзельнікаў паходу — шэсць гадоў. У групе павінна быць не менш за восем чалавек.

Пры падрыхтоўцы да паходу кіраўнік абавязаны правесці інструктаж з удзельнікамі па тэхніцы бяспекі, праверыць веды і навыкі, якія забяспечваюць бяспеку, уменне плаваць, аказваць даўрачэбную дапамогу, праверыць наяўнасць даведак аб стане здароўя, падрыхтаваць аптэчку з невялікай колькасцю медыкаментаў, перавязачных матэрыялаў, дэзінфікуючых растворaў і інш.

Калі турысцкая група сфарміравалася, неабходна размеркаваць абавязкі паміж удзельнікамі паходу. Пры гэтым улічваюцца падрыхтоўка, здольнасці і інтарэсы кожнага турыста. У турысцкім паходзе не павінна быць пабочных назіральнікаў. Кожнаму — канкрэтнае заданне і даручэнне.

У турысцкім паходзе важна захоўваць і выконваць правілы паводзін на вуліцы, у грамадскіх месцах, на прыродзе,

У час руху па горадзе, населеным пункце. Пры карыстанні транспартнымі сродкамі група рухаецца строем. Наперадзе ідзе кіраўнік, а замыкае групу яго намеснік (памочнік). У полі, рэдкім лесе і па прасёлкавых дарогах юныя турысты рухаюцца групай.

Тэмп руху не павінен быць вельмі напружаным. Праз кожныя 40 — 50 хвілін руху варта рабіць 10-15-хвілінныя прывалы для адпачынку. У спякотны час ісці небяспечна, можа здарыцца цеплавы ці сонечны ўдар. Таму лепш адправіцца ў дарогу як мага раней (у летнія дні — не пазней чым у 8 гадзін раніцы).

Рух у дарозе павінен чаргавацца з невялікімі прыпынкамі і больш працяглым прывалам. Вялікі прывал робяць прыкладна з 10.00 — 12.30 да 15.00 — 16.00 гадзін дня.

У турысцкім паходзе асабліва ўважліва трэба адносіцца да выбару вады. Найбольш небяспечнай можа аказацца застаялая вада ў сажалках, балотах, дажджавых вадаёмах. Лепей за ўсё карыстацца вадой з крыніц. Не трэба піць сырую ваду. Кіпячэнне на працягу 15-20 хвілін абясшкоджвае ваду ад мікробаў і прымесяў.

У турысцкіх паходах у час прывалаў меры бяспекі павінны строга выконвацца ва ўсім — пры нарыхтоўцы паліва, распальванні вогнішча, прыгатаванні ежы, гульнях і спаборніцтвах.

Арганізацыя і правядзенне турысцкіх паходаў, падарожжаў — гэта вельмі складаны навучальна-выхаваўчы працэс, а для педагога-кіраўніка паход — напружаная работа па навучанні і выхаванні дзяцей і падлеткаў. Важны выхаваўчы момант у турысцкай групе — апора кіраўніка на актыў. Таму для вырашэння паўсядзённых арганізацыйных пытанняў мэтазгодна стварыць савет. У яго могуць увайсці найбольш актыўныя, энергічныя і ініцыятыўныя вучні. У час паходу на савеце падводзяцца вынікі дня, абмяркоўваюцца планы на наступны дзень, пытанні забеспячэння прадуктамі харчавання і інш. На савеце могуць абмяркоўвацца пытанні маральнага і фізічнага стану ўдзельнікаў паходу, станоўчыя і адмоўныя моманты ў іх паводзінах.

Важна, каб у турысцкай групе было сапраўднае, а не фармальнае самакіраванне і самаабслугоўванне. Асобныя кіраўнікі імкнуцца вырашыць усе пытанні самастойна, часам ставяць палаткі, рыхтуюць ежу, добраўпарадкоўваюць тэрыторыю і г.д.

Разам з тым самакіраванне можа быць эфектыўным толькі пры ўмелай арганізацыі. Гэта — арганізаваны рух па маршруце, дзяжурства на стаянцы, размеркаванне месцаў у вагоне поезда, выкананне правілаў бяспекі, адносіны да навакольнага асяроддзя і інш. Калі абавязкі існуюць толькі фармальна і фактычна ўсё вырашае і робіць кіраўнік, карысці ад самакіравання і самаабслугоўвання не будзе.

Кіраўнік павінен быць педагогам, дарадчыкам, кантралёрам, але не пераходзіць рысы, якая парушае адказнасць за дзяцей, за даручаную справу.

Пры асэнсаванні дзецьмі і падлеткамі ўбачанага і зробленага вялікую дапамогу могуць аказваць гутаркі ля вячэрняга вогнішча. Па магчымасці іх неабходна праводзіць кожны вечар. Тут падводзяцца вынікі дня, робяцца заўвагі аб дзейнасці дзяжурных, кухараў, краязнаўцаў, паводзінах асобных удзельнікаў паходу. Тут па-асаблівому ўспрымаюцца задушэўныя турысцкія песні, расказы і ўспаміны ўдзельнікаў паходу. Нярэдка менавіта тут, ля вячэрняга вогнішча, у адкрытай размове лепш аналізаваць канфліктныя сітуацыі, якія ўзнікаюць паміж асобнымі падлеткамі.

У стварэнні цёплай, сяброўскай атмасферы ў турысцкай групе важную ролю могуць адыграць асабістыя гутаркі кіраўніка з дзецьмі сам-насам. Цяжкасці паходнага жыцця, адарванасць ад бацькоў не ўсімі падлеткамі пераносяцца аднолькава.

У такіх выпадках дзецям патрэбны сяброўскі клопат з боку кіраўніка. Неабходна даведацца, што хвалюе падлетка, усяліць у яго аптымізм.

У паходзе трэба праводзіць спартыўныя гульні з мячом, спаборніцтвы па шашках, шахматах, арыентаванні на мясцовасці і інш. Карысныя і віктарыны рознай тэматыкі.

Пераможцы розных спаборніцтваў і конкурсаў павінны быць адзначаны. Прызы могуць быць самаробнымі — букет палявых кветак, лялька, змайстраваная з шышак і травы, знойдзены прыгожы каменьчык, верш і г.д.

У паходзе юныя турысты звычайна збіраюць краязнаўчы матэрыял, калекцыі раслін і насякомых, вядуць запісы ў дзённіках, робяць замалёўкі і фотаздымкі. Незанатаваныя назіранні — страчаная каштоўнасць. Таму збіраць матэрыял і весці запісы неабходна пастаянна і добрасумленна. Гэтыя матэрыялы папаўняюць экспазіцыю школьных музеяў, могуць быць выкарыстаны ў навучальна-выхаваўчым працэсе.

Калі турысцкі паход завершаны, адразу ж неабходна падвесці вынікі спартыўнай часткі паходу, апрацаваць матэрыялы па заданні, зрабіць падрабязную справаздачу. У ёй звычайна ўказваюцца школа ці іншая выхаваўчая ўстанова, якая арганізавала турысцкі паход, мэта і задачы, катэгорыя складанасці падарожжа, склад удзельнікаў групы (прозвішча, імя і імя па бацьку), аб'ём і змест выканаўнай на маршруце краязнаўчай і грамадска карыснай працы, агульнагеаграфічная і эканамічная характарыстыка мясцовасці, дзе пабывалі юныя турысты. У справаздачы павінны быць картаграфічны матэрыял, заключэнне і рэкамендацыі. Добрасумленна зробленая справаздача — каштоўны матэрыял для іншых турысцкіх груп, якія пажадаюць прайсці тым жа марштурам.

Турысцкія паходы дапамагаюць педагогу зрабіць працэс навучання больш эфектыўным, даюць магчымасць вучням бліжэй дакрануцца да сапраўдных ведаў, глыбей адчуць радасць пазнання, паўней зразумець гістарычныя падзеі і прыродныя з'явы.

Мікалай ГЕРАСІМЕНКА, метадыст Рэспубліканскага цэнтра дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій.

Анонсы

...І капуснік для творчай эліты

З 21 па 24 траўня ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі пад патранажам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пройдзе міжнародны семінар "П'еса для тэатра ў прасторы трэцяга тысячагоддзя", у якім возьмуць удзел прадстаўнікі Беларусі, Польшчы, Украіны і Расіі.

Чакаецца прыезд вядучых драматургаў Расіі: Н.Птушкінай, К.Драгунскай, А.Яхантава, Р.Бялецкага. Украіну прадставяць сакратар Нацыянальнага саюза пісьменнікаў, заслужаны дзеяч мастацтваў, вядомы драматург і празаік Я.Стэльмах, народная артыстка Украіны, драматург Л.Кушкова, галоўны рэдактар Міністэрства культуры В.Няволаў і група маладых драматургаў. З Польшчы будуць галоўны рэдактар часопіса "Тэатр" Я.Майхерак і рэдактар спецыяльнага драматургічнага часопіса "Дыялогі" М.Радзівон.

Сярод беларускіх майстроў сцэнічнай інтрыгі ўдзел у семінары возьмуць А.Дударэў, А.Папова, А.Дзялендзік, Г.Марчук, С.Кавалёў, А.Ждан, П.Васючэнка і інш.

У праграме семінара — экспрэс-паказ п'есы "Жанчыны Бергмана" Мікалая Рудкоўскага (прэм'ерай спектакля пад такой назвай пачне чарговы сезон Тэатр беларускай драматургіі), а таксама сцэнічныя чытанні п'ес "Крыж" А.Дударава, "Вандроўнікі ў Нью-Йорку" А.Паповай, "Адэль" Я.Таганава.

Над падрыхтоўкай экспрэс-паказаў працуюць сёння вядомыя рэжысёры В.Анісенка, В.Катавіцкі, В.Грыгалюнас, В.Дудзін. У першы дзень семінара плануецца капуснік з удзелам маладзёжнай студыі тэатра, прысвечаны сустрэчы гасцей.

Для ўдзелу ў семінары запрашаюцца выкладчыкі і студэнты творчых факультэтаў ВНУ краіны, знаўцы і аматары сцэнічнага мастацтва.

Удакладніць праграму і атрымаць любую дадатковую інфармацыю можна, калі патэлефанаваць у літаратурна-драматычны аддзел Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі па тэлефоне 268-60-21.

Рон САФРОНАЎ.

Праграма тэлепередач

ПАНЯДЗЕЛАК, 21 МАЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 18.00, 23.50 Навіны. **7.10** Добрай раніцы, Беларусь! **8.00** Рэзананс.
9.15 Тэлебарометр.
9.30 Здароўе.
10.00 "Усе мае дзеці".
11.10 "Чалавек мора".
12.05 "Новыя прыгоды гномаў".
13.15 "Дзяржаўная граніца". Фільм чацвёрты. 1-я серыя.
14.35 Урокі Н. Наважылавай.
15.00 Навіны (з сурдаперакладам).
15.15 "Матрос Чыжык". Маст. фільм для дзяцей.
16.40 Тэленавігатар.
17.00 "Усе мае дзеці".
18.20 Зона Ікс.
18.30 Палітычныя дыялогі.
19.00 "Шалёная". Баявік.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Правы чалавека: погляд у свет. **22.00** "Чалавек мора".
22.55 Стадыён.
23.20 Планета "АРТ".
0.05 Плаванне. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.

ГРТ

15.55 "Паветраныя замкі".
17.00 Вячэрнія навіны.
17.25 Спецрэпартаж.
17.45 Чакай мяне.
18.40 "Хто хоча стаць мільянерам?".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
21.00 "Сакрэтныя матэрыялы".
22.45 "Вялікая адзінота Андрэя Сахарава".
23.35 Начныя навіны.
23.50 "Чалавек ніадкуль".

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
8.15 Баявік "Чырвоная гарачыня".
10.30 "Санта-Барбара".
16.30 "Простыя ісціны".
17.00 "Сетка".
18.00 "Камісар Рэкс".
19.30 Весткі—Масква.
19.50 Камедыя "Горка!".
21.40 М. Жванецкі. "Простыя рэчы". **22.30** Пасля "Вестак".
22.40 Падрабязнасці.
22.50 "Акадэмік Сахараў. Невядомыя матэрыялы". Дак. фільм.
23.20 Дэтэктыў "Шантаж".
1.10 Спорт за тыдзень.

КУЛЬТУРА

7.05 Навіны культуры.
7.20 Пасля навін...
7.40 "Рукі ўгору!". Маст. фільм.
8.45 М. Брух. Канцэрт для скрыпкі з аркестрам.
9.10 Тым часам.
9.40 "Сурыкаты". Дак. фільм.
10.35 "Удачы, Фрэнчы". Маст. фільм. 1-я серыя. Частка 1-я.
11.30 Навіны культуры.
11.40 "Час жыць, час любіць". Маст. фільм.
13.05 "У ансамблі з Крэмерам".
13.30 Навіны культуры.
13.45 Мультфільмы.
14.15 Сферы.
15.00 Навіны.
15.10 "Востраў-матылёк".
15.35 Мультфільм.
15.45 "Пераможцы". Дак. фільм.
16.10 Звышнавука. "Кібермозг".
16.35 "Удачы, Фрэнчы". Маст. фільм. 1-я серыя. Частка 1-я.
17.30 Навіны культуры.
17.40 "Свет авіяцыі".
18.05 "Што вы на гэта скажаце?" Дак. фільм.
18.40 "Юрый Сіманаў. Юбілей".
19.20 "Вячэрняя казка".
19.30 Навіны культуры.
19.50 В. Шэкспір "Рычард III". Спектакль. Частка 1-я.
21.25 Пасля навін...
21.45 "Рычард III". Частка 2-я.
22.30 "Амазонкі кінаавангарда".
23.00 Навіны культуры.

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30 Сёння раніцай.
5.15, 6.15, 7.15 Спорт, надвор'е.
5.20, 6.35 Крымінал.
5.35, 6.45 Вялікія грошы.
5.45, 7.20 У запас.
6.20, 7.40 Карданны вал.
7.50 "Каханне і тайны Сансет Біч".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
9.25 "Каханне і тайны Сансет Біч".
10.40 Лялькі.
11.30 Фільм "Паядынак".
13.30 Стары тэлевізар.
14.40 У запас.
15.30 "Элен і рабяты".
16.10 "Страсць".
17.05 "О, шчасліўчык!".
18.30 Герой дня.
18.45 Крымінал.
19.05 "Дзень нараджэння Буржуя".
20.20 "Крымінальная Расія".
21.50 "Помста без мяжы".
23.25 "Паўшыя анёлы-2".

СТБ

15.15 Інфармпраграма "168 гадзін Мінска". **16.00** "Жалезны чалавек". Мультсерыял.
16.30 "Дыпладокі". Мультсерыял.
17.00 "Дарма і Грэг".
17.30 Навіны СТБ.
17.45 Музычна-забаўляльная праграма. **18.00** "Раузан". Тэленавела.
19.00 "Выпадковы сведка".
19.30 Навіны "СТБ-24 гадзіны".
19.45 Гарснаб прадстаўляе: "Гарзаказ-2001".
19.55 "Культурнае жыццё Мінска".
20.00 "Мэш". **20.30** Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Марасейка, 12".
22.05 Баявік "Зноў у справе".
0.05 "Віртуальны свет".
0.20 Футбольны кур'ер.
0.40 Музычна-забаўляльная праграма.

АЎТОРАК, 22 МАЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 18.00, 0.31 Навіны.
7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.05 "Усе мае дзеці".
9.15 "Тайны свет Алекс Мак".
9.45 Стадыён.
10.10 Дак. серыял "У фокусе" (Германія).
11.10 "Чалавек мора".
12.00 "Адысея каманды Кухто".
12.30 Крымінальнае дасье.
13.15 "Дзяржаўная граніца". Фільм чацвёрты. 2-я серыя.
14.35 Фільмы братоў Люм'ер.
14.40 "Скарбы сусветнай культуры".
15.00 Навіны (з сурдаперакладам).
15.10 "Казкі бацькі Кастара".
15.20 "Усе на арбіту!".
15.35 "Тайны свет Алекс Мак".
16.05 "5х5".
17.00 "Усе мае дзеці".
18.20 Зона Ікс.
18.35 "Масква—Мінск".
18.55 Камедыйны дэтэктыў "Старая шэльма" (Францыя).
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 "Чалавек мора".
22.45 Спорт-кур'ер.
22.55 Ток-шоу "Будні".
23.40 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. "Дынама" (Мінск)—"Гомель". 2-гі тайм.

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00 Навіны.
8.15 "Паветраныя замкі".
9.55 "Хто хоча стаць мільянерам?".
14.20 Цар гары.
14.45 ...Да шаснаццаці і старэй.
15.20 "Пакемон".
15.45 "Ералаш".
15.55 "Паветраныя замкі".
17.00 Вячэрнія навіны.
17.25 Рускі экстрым.
17.55 Як гэта было. "Шахцёрскія хваляванні ў СССР". 1989 год.
18.40 "Забойная сіла: Місія выканальная-2".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
21.00 Камедыя "Крыўда".
22.40 "Жыццё выдатных людзей".
23.15 Начныя навіны.
23.30 Фільм "Майстрыха".

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
8.15 Камедыя "Горка!".
10.30 "Санта-Барбара".
16.30 "Простыя ісціны".
17.00 "Сетка".
18.00 "Камісар Рэкс".
19.30 Весткі—Масква.
19.50 Баявік "Стэлс" у дзеянні".
21.30 "Расія — пачатак". Дак. серыял. **22.30** Пасля "Вестак".
22.40 Падрабязнасці.
22.50 Мужчына і жанчына.
23.45 Фільм "Цела будзе схавана ў зямлю, а старшы мічман будзе спяваць".

КУЛЬТУРА

7.05 Навіны культуры.
7.20 Пасля навін...
7.40 "Удовы". Маст. фільм.
9.05 "Свет авіяцыі".
9.30 Р. Шуман "Экзэрсісы".
9.50 Русь-вёска.
10.35 "Удачы, Фрэнчы". 1-я серыя. Частка 2-я.
11.40 "Жанчына і чацвёра яе мужчын". Маст. фільм.
13.05 Мультфільм.
13.30 Навіны культуры.
13.45 "Разам з Фафалем".
13.55 "Браты Трэццяковы". Дак. фільм.
14.20 "Пушкін і лёсы рускай культуры". **15.00** Навіны.
15.10 "Востраў-матылёк".
15.35 "Справа жыцейская".
16.05 "Мы прыйшлі з мора".
16.35 "Удачы, Фрэнчы". 1-я серыя. Частка 2-я.
17.30 Навіны культуры.
17.40 "Ноу-хау".
17.55 "Крэмль музычны".
18.20 "Цытаты з жыцця".
19.00 "Вячэрняя казка".
19.05 "Ох, ужо гэтыя дзеткі".
19.30 Навіны культуры.
19.50 Русь-вёска.
20.40 Пасля навін...
21.00 Сцэнаграма.
21.30 "Удовы". Маст. фільм.
23.00 Навіны культуры.

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30 Сёння раніцай.
5.15, 6.15, 7.15 Спорт, надвор'е.
5.20, 6.35 Крымінал.
5.35, 6.45 Вялікія грошы.
5.45, 7.20 У запас.
6.20, 7.40 Карданны вал.
7.50 "Дзень нараджэння Буржуя".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
9.25 "Каханне і тайны Сансет Біч".
10.25 Крымінал.
11.30 Фільм "Падводная лодка "Т-9". **13.30** Стары тэлевізар.
14.40 У запас.
15.30 "Элен і рабяты".
16.10 "Страсць".
17.05 "О, шчасліўчык!".
18.30 Герой дня.
18.45 Крымінал.
19.05 "Дзень нараджэння Буржуя".
20.15 Зусім сакрэтна.
21.50 "Помста без мяжы".
23.25 Фільм "Ядавіты плошч".

СТБ

6.00 "Жалезны чалавек".
6.30 "Дыпладокі".
7.00 "Манітор".
7.30 Навіны СНД.
7.45 "Выпадковы сведка".
8.30 Навіны "СТБ-24 гадзіны".
8.45 Баявік "Зноў у справе".
10.35 "Дыскаверы" на СТБ.
10.55 "Віртуальны свет".
11.05 Меладрама "Я не анёл".
13.20 "Кінаафіша Мінска".
13.30, 17.30 Навіны СТБ.
13.45 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
14.00 "Пляж".
15.00 "Марасейка, 12".
16.00 "Жалезны чалавек".
16.30 "Дыпладокі".
17.00 "Дарма і Грэг".
17.45 Гараскоп СТБ.
17.50 "Культурнае жыццё Мінска".
18.00 "Раузан". Тэленавела.
19.00 "Выпадковы сведка".
19.30 Навіны "СТБ-24 гадзіны".
19.45 "Віртуальны свет".
19.55 "Культурнае жыццё Мінска".
20.00 "Мэш".
20.30 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ. **20.45** "Вечарніца".
21.00 "Марасейка, 12".
22.05 Прыгодніцкі фільм "Племя цемры".
0.20 Навіны СНД.
0.35 Меладрама "Я не анёл".

СЕРАДА, 23 МАЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 18.00, 23.25 Навіны.
7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.05 "Усе мае дзеці".
9.15 "Тайны свет Алекс Мак".
9.45 Мультыклуб.
10.10 25-ы кадр.
10.30 Сутнасць.
11.10 "Чалавек мора".
12.00 "24-ы фестываль цыркаў у Монтэ-Карла".
13.10 "Дзяржаўная граніца". Фільм пяты, 1-я серыя.
14.20 Фільмы братоў Люм'ер.
14.25 "Скарбы сусветнай культуры".
15.00 Навіны (з сурдаперакладам).
15.10 "Казкі бацькі Кастара".
15.20 "Усе на арбіту!".
15.35 "Тайны свет Алекс Мак".
16.05 "5х5".
17.00 "Усе мае дзеці".
18.20 Зона Ікс.
18.30 Саюзнае веча.
18.55 М. Няёлава і А. Абдулаў у крымінальнай меладраме "Турэмны раманс".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 "Чалавек мора".
22.50 Спорт-кур'ер.
23.00 "Сустрэча ў Траецкім".

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00 Навіны.
8.15 "Паветраныя замкі".
9.15 Што? Дзе? Калі?
10.25 "З лёгкай парай!".
14.20 Покліч джунгляў.
14.45 ...Да шаснаццаці і старэй.
15.20 "Пакемон".
15.45 "Ералаш".
15.55 "Паветраныя замкі".
17.00 Вячэрнія навіны.
17.25 "Усе падарожжы каманды Кусто".
17.55 Чалавек і закон.
18.40 "Хто хоча стаць мільянерам?".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
21.00 Фільм "Закаханыя".
23.00 "Цывілізацыя".
23.30 Начныя навіны.
23.45 Трылер "Дыверсант".

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
8.15 Баявік "Стэлс" у дзеянні".
10.30 "Санта-Барбара".
16.30 "Простыя ісціны".
17.00 "Сетка".
18.00 "Камісар Рэкс".
19.30 Весткі—Масква.
19.50 Фільм "Зараджаныя смерцю".
21.50 "Кнот".
22.30 Пасля "Вестак".
22.40 Падрабязнасці.
22.50 Дзяжурная часць.
23.20 Дэтэктыў "Месца злачынства".

КУЛЬТУРА

7.05 Навіны культуры.
7.20 Пасля навін...
9.45 "Мы прыйшлі з мора".
10.10 "Механічная сімфонія". "Будучыня Евы". Дак. фільмы.
10.35 "Удачы, Фрэнчы". 2-я серыя. Частка 1-я.
11.30 Навіны культуры.
11.40 "Саната над возерам". Маст. фільм.
13.05 "Мастак Валянціна Казакевіч".
13.30 Навіны культуры.
13.45 "Разам з Фафалем".
13.55 Тэлеэнцыклапедыя.
14.10 "Пушкін і лёсы рускай культуры".
15.10 "Востраў-матылёк".
15.35 Мультфільмы.
16.00 Усе суры Карана.
16.10 "Кансіліум".
16.35 "Удачы, Фрэнчы". 2-я серыя. Частка 1-я.
17.30 Навіны культуры.
17.40 "Расійскі кур'ер".
18.05 Хто мы? "Рэформы па-руску".
18.30 Магія кіно.
18.45 Тайны партрэтнага фае.
19.10 "Вячэрняя казка".
19.20 Мультфільм.
19.30 Навіны культуры..
19.50 "Механічная сімф